Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
9 КАСТРЫЧНІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 197 (30331)



ПАДВОРАК У ПАРАДКУ? ПРЫБІРАЕМ ВУЛІЦУ! МС

БАБУЛІ СТВАРАЛІ ШЭДЭЎРЫ. І МЫ! 11



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

## КОРАТКА

• У Беларусі, паводле даных на 8 кастрычніка, пасеяна больш як 1,289 млн га азімых збожжавых на зерне, што складае 85 працэнтаў да плана.

• У лясах Брэсцкай вобласці на пашкоджаных ад буралому ўчастках плануюць высадзіць больш за 140 тысяч саджанцаў.

• «Белтэлекам» будзе выкарыстоўваць у сваіх паслугах магчымасці штучнага інтэлекту.

• У Беларусі сёлета зацверджана 614 дзяржаўных стандартаў, у тым ліку 528 міждзяржаўных і 86 нацыянальных, якія датычацца лёгкай і хімічнай прамысловасці, электратэхнікі і радыёэлектронікі, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана БЕЛАШ, начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«З 2020 года шматдзетныя сем'і атрымалі права на датэрміновае выкарыстанне сродкаў сямейнага капіталу, што дало магчымасць многім з іх палепшыць жыллёвыя ўмовы або аплаціць адукацыйныя і медыцынскія паслугі для дзяцей. На 1 кастрычніка ў Беларусбанку адкрыта больш за 140 тысяч дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», а амаль 86 тысяч сем'яў ужо прынялі рашэнні аб датэрміновым выкарыстанні гэтых сродкаў, 81 % якіх накіраваны на вырашэнне жыллёвых пытанняў».*

ISSN 1990 — 763X
24197
9 771990 763008

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НАМ ПАТРЭБНЫ МОЦНЫ САЮЗ МОЦНЫХ, ЭКАНАМІЧНА САМАДАСТАТКОВЫХ СУВЕРЭННЫХ ДЗЯРЖАЎ»

**На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сіле гістарычнага адзінства народаў Садружнасці**



**Выступаючы на высокім саміце ў Маскве, Прэзідэнт Беларусі назваў механізм узаемадзеяння ў рамках СНД найважнейшым інструментам умацавання палітычнай і эканамічнай сілы дзяржаў Садружнасці і рэгіёна ў цэлым. Ён звярнуў увагу на тое, што ў СНД нямала краін, якія маюць найвялікшы патэнцыял: «Гэта багатыя дзяржавы. Багатыя тымі рэсурсамі, у якіх сёння вельмі мае патрэбу ўся планета». «Мы стаім на плячах некалькіх пакаленняў, якія здолелі ў свой час фактычна з нуля стварыць магутную дзяржаву, якая стала адным з геапалітычных цэнтраў сілы. Яна фарміравалася на агульнасці мэт і павазе традыцый і культур нашых народаў, таму была моцнай. Аналагаў савецкага вопыту нацыянальнага будаўніцтва ў гісторыі няма», — заявіў беларускі лідар.**

СТАР. 2

Год якасці

# ЧАС РАБІЦЬ ЗАПАСЫ

**Вітамінаў хопіць усім**



**Восень для спецыялістаў аграрнай галіны — час падводзіць вынікі, і сёлета яны годныя. Усё яшчэ працягваецца ўборка ўраджаю, у разгары закладка прадукцыі ў сховішчы, але ўжо відавочна: аб'ёмы агародніны, садавіны, ягад здольныя поўнасцю закрыць патрэбы ўнутранага рынку. Хапае на тое, каб сфарміраваць стабілізацыйныя фонды, задаволіць патрэбы перапрацоўчай прамысловасці і запыт насельніцтва ў экалагічна чыстых, карысных вітамінах, з любоўю вырашчаных на беларускай зямлі — у сельскагаспадарчых арганізацыях, фермерскіх і сялянскіх гаспадарках.**

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# САГРЭЦЦА — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ЗГАРЭЦЬ

**З пачаткам ацяпляльнага сезона ўзрасла колькасць пажараў**

**Надзвычай цёплы верасень змяніўся рэзкім пахаладаннем, людзі пачалі праграваць жыллё. Калі ў гарадскім фондзе змяненне надвор'я адчуваецца не так востра, то ў вясковых дамах нават гэткай восеньскай парой можна змерзнуць. Праўда, у сельскіх жыхароў, якія не залежаць ад цэнтралізаванага ацяплення, ёсць свая перавага: яны могуць уключыць кацёл або прапаліць у печы тады, калі ім захочацца. Аднак, у гэтых выпадках важна думаць не толькі пра камфорт, а яшчэ і пра бяспеку.**



СТАР. 5

# «НАМ ПАТРЭБНЫ МОЦНЫ САЮЗ МОЦНЫХ, ЭКАНАМІЧНА САМАДАСТАТКОВЫХ СУВЕРЭННЫХ ДЗЯРЖАЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У сувязі з гэтым, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, няма нічога дзіўнага ў тым, што новае аб'яднанне цяпер ужо суверэнных дзяржаў непажаданае ў цяперашняй геапалітычнай канфігурацыі. «Мы гэта заўсёды ведалі, таму зрабілі ўсё, каб захаваць такую ўнікальную мадэль, што нам удалося, — сказаў ён. — Паглядзіце: Савецкага Саюза даўно няма, а спробы дэманізацыі савецкага мінулага на Захадзе не спыняюцца. Там прадаўжаюць барацьбу з прывідам. Аб чым гэта сведчыць? Аб сіле гістарычнага адзінства нашых народаў, якая да гэтага часу трывожыць і Вашынгтон, і Брусель».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што краінам трэба даражыць тым, што яны маюць у Садружнасці, і заўважыў, што «было б вельмі добра, калі б у нашу сям'ю вярнулася Грузія, аднавіла свой поўнафарматны ўдзел Малдова, адумаліся ўлады Украіны, у аднаўленні нармальнага жыцця якой нам давядзецца ўдзельнічаць».

Беларускі лідар прапанаваў падумаць, як больш эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял рэгіянальнай інтэграцыі. Многае ўжо зроблена, але ёсць і да чаго імкнуцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы і абазначыў у гэтым некалькі напрамкаў.

## Першы — умацаванне міжнароднага статусу СНД

«Садружнасць павінна пастаянна прысутнічаць у сусветным інфармацыйным парадку дня. Мы адзіныя ў ацэнцы многіх падзей, якія ўплываюць на развіццё не толькі рэгіёна, але і чалавецтва ў цэлым. Гаворым аб гэтым на розных пляцоўках, але, на жаль, часта паасобку», — звярнуў увагу беларускі лідар. — Трэба часцей аб'ядноўваць свае галасы ў адзін — голас СНД».

«Важна разам выступаць супраць незаконных аднабаковых эканамічных абмежаванняў. Яны сёння датычацца не толькі Беларусі і Расіі. Пад пагрозай другасных санкцый знаходзяцца фактычна ўсе краіны Садружнасці», — дадаў ён.

## Другі напрамак — супрацьдзеянне насаджэнню чужых экстрэмісцкіх ідэалогій, спробам уцягвання грамадзян у супрацьпраўную, у тым ліку тэрарыстычную дзейнасць

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў свайму калегу Прэзідэнту Узбекістана Шаўкату Мірзіёеву за своечасовую ініцыятыву па распрацоўцы Праграмы супрацоўніцтва ў галіне дэрадыкалізацыі. Кіраўнік дзяржавы таксама прапанаваў даручыць Выканкаму СНД актывізаваць абмен вопытам паміж праваахоўнікамі, якія спецыялізуюцца на пытаннях кібербяспекі.

## Трэці напрамак — дасягненне тэхналагічнага суверэнітэту на прасторы СНД

Гэтую задачу Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў як складаную і амбіцыйную. «Мы вельмі шмат прымаем рашэнняў, шмат гаворым, але, давайце шчыра, у асноўным жа гэта гуманітарнае супрацоўніцтва. А эканоміка — аснова ўсяго, — заўважыў беларускі лідар. — Таму тэхналагічны суверэнітэт сёння — пытанне нумар адзін, каб нармальна функцыянавала эканоміка нашых дзяржаў».

«Заходнія праваўладальнікі найноўшых тэхналагічных рашэнняў адмаўляюцца дзяліцца сваімі дасягненнямі, не гарантуюць суправаджэнне і абслугоўванне ўжо закупленых законным чынам тэхнікі і абсталявання. Гэта датычыцца і ахоўвы здароўя, што жахліва. Таму нам жыццёва неабходна ўкараненне ў вытворчасць сваіх напрацовак, патрэбна ўласная кампанентная база», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

## Чацвёрты напрамак — прасоўванне і культываванне сістэмы каштоўнасцяў Садружнасці

Гэты напрамак Аляксандр Лукашэнка назваў стратэгічна важным. Гаворка аб каштоўнасцях, якія «гістарычна склаліся, а не навязаных або надуманых еўрапейскіх ці амерыканскіх». «Гэта тое, што застаецца, калі на змену прыходзяць новыя пакаленні», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка абазначыў, што неабходна перадаць новаму пакаленню. І гэта ў тым ліку ўнікальны савецкі досвед руху народаў да адзінай мэты без ушчамлення нацыянальных інтарэсаў. «Гэты ўзор кансалідацыі разнастайных культур, рэлігій, традыцый у імя мэты», — сказаў Прэзідэнт.

«Нашы дзеці павінны ведаць агульныя гістарычныя дасягненні, такія як Вялікая Перамога, працоўны подзвіг пасляваеннага пакалення, першы палёт у космас і многія іншыя. У кожным поспеху — сумесны ўклад нашых народаў. Гэтую гісторыю мы проста абавязаны перадаць з рук у рукі тым, хто прыйдзе пасля нас», — працягнуў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Паводле яго слоў, тут мала расказваць, пісаць кнігі, здымаць фільмы, але важна захаваць узровень простых чалавечых зносін. Гэтай задачы, напрыклад, адпавядае адраджэнне міжнародных маладзёжных будоўляў у рамках Садружнасці. І такую традыцыю ў Беларусі ўжо вярнулі. Так, у Брэсцкай крэпасці працягваецца маладзёжная будоўля Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання, ва ўзвядзенні якога прымае ўдзел моладзь СНД.

У сваім выступленні на саміце Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў, што краіны былі разам, калі святкавалі дзень Вялікай Перамогі 80 гадоў таму. І Беларусь падтрымлівае аб'яўленне наступнага года Годам 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — Годам міру і адзінства ў барацьбе з нацызмам, які зноў становіцца пагрозай усяму чалавецтву.

Гістарычна справядлівым Прэзідэнт назваў і падрыхтаванае рашэнне аб заснаванні ганаровага звання СНД — «Горад працоўнай славы. 1941—1945 гады». «Без вялікай ахвярнай працы савецкіх людзей у тыле не было б і Вялікай Перамогі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што бакі змогуць знайсці аптымальныя рашэнні па ўсіх пытаннях парадку дня, якія адпавядаюць інтарэсам краін.

## «Скрасці можна памяць, але не праўду»

У час пасяджэння ў пашыраным складзе Прэзідэнт шчыра і пранікнёна прадставіў сумесны Зварот да народаў краін Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з 80-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў за права прадставіць гэты зварот кіраўнікам дзяржаў. «Нашай краіне гэта права дадзена самой гісторыяй — гісторыяй савецкай рэспублікі, якая першай прыняла ўдар дывізій вермахта, першай, якая затрымала іх пераможнае шэсце па Еўропе. Гэта права нам далі героі, якія насмерць стаялі ў Брэсцкай крэпасці і на подступах да ўсіх беларускіх гарадоў, закрываючы шлях на Маскву. Плячо ў плячо з беларусамі змагаліся прадстаўнікі 70 нацыянальнасцяў. І кожны ведаў, што ён супрацьстаіць абсалютнаму сусветнаму злу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што сёння імёны многіх ушанаваны ў назвах праспектаў і вуліц беларускіх гарадоў, у помніках і мемарыялах. «Мы памятаем свах герояў. Але памятаем і боль, гора, пакуты мільёнаў нашых з вамі суайчыннікаў. Кожныя 30 секунд звон Хатыні нагадвае нам аб тым, што звыш 600 беларускіх вёсак былі спалены разам з жанчынамі, дзецьмі і старымі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Колькі б гадоў ні прайшло, мы і сёння чуем рэха немага крыку аб дапамозе знясіленых жыхароў блакаднага Ленінграда, плач мільёнаў савецкіх маці і дзяцей, чые сыны, дочкі і бацькі не вярнуліся з палёў бітваў».

Колькасць ахвяр той вайны жахлівая, падкрэсліў беларускі лідар, але яна да гэтага часу не закрытая. Напрыклад, на тэрыторыі Беларусі працягваюць знаходзіць масавыя пахаванні сотняў і тысяч закатаваных і расстраляных.

«А ў гэты час у некаторых краінах вызваленай Еўропы ўшаноўваюць легіянераў СС. Неанацысты адкрыта маршыруюць па вуліцах, зносяць і апаганьваюць помнікі воінам-вызваліцелям, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Моладзь, якая ўдзельнічае ў гэтым шабашы, выхаваная ў духу нацыянальнай перавагі і рэваншызму і не мае ні найменшага разумення аб ходзе гісторыі. Яны не ведаюць, што разам з савецкімі людзьмі ваявалі іх продкі: тыя ж прыбалты, палякі, бельгійцы і нават немцы. Іх прымусілі забыцца, што фактам свайго нараджэння яны абавязаны савецкім воінам, якія заплацілі жыццём за мір на іх зямлі, за свабоду іх краін і за будучыню іх народаў».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўкрасці можна памяць, але не праўду: «Калі б не было гераізму савецкага народа — не было б тых дзяржаў і людзей, якія робяць усё, каб дыскрэдытаваць подзвіг савецкага народа і забраць нашу Вялікую Перамогу, якая нас так аб'ядноўвае. Мы ведаем, чаму. Гістарычная праўда нашых народаў з'яўляецца перашкодай у рэалізацыі доўгатэрміновых геапалітычных планаў Захаду, у якіх няма месца іншым моцным дзяржавам».

Прэзідэнт расказаў, што ў адказ на гэтыя дзеянні ў Канстытуцыю Беларусі унесены палажэнні аб абароне гістарычнай праўды і памяці аб подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Прыняты законы аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму і аб генацыдзе беларускага народа.

«На шчасце, у разуменні важнасці абароны подзвігу нашых народаў і нашай агульнай памяці мы абсалютна сёння адзіныя. Мы робім гэта ў імя міру. У імя міру мы прымаем сённяшні Зварот. Ён у поўнай меры адпавядае інтарэсам не толькі нашай Садружнасці, але і ўсяго чалавецтва, якое як ніколі знаходзіцца на мяжы новай катастрофы», — заявіў беларускі лідар. Ён перакананы, што прыняцце Звароту — гэта значны палітычны крок, які прадэманструе праўдзівую ацэнку ролі народаў краін СНД у перамозе над фашызмам, павагу да агульнага гістарычнага мінулага і канструктыўнае стаўленне да сумеснай будучыні.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

# Пра ядзерную дактрыну, пагрозы з боку Украіны і падарунак Пуціну

## Перад пачаткам пасяджэння ў Крамлі Прэзідэнт паразмаўляў з журналістамі

У размове з імі Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў змены, унесеныя нядаўна ў ядзерную дактрыну Расіі. Кіраўніка дзяржавы спыталі, што ён адчуў у сувязі са зменянямі ў дакуменце, якія датычацца і тэрыторыі Беларусі. «Цяпер не адчуваю. Таму што я ўжо адчуў у той час, калі на тэрыторыю Беларусі вярнулася самая сур'ёзная зброя. Вось тады я адчуў. А цяпер гэта фактычна ўзмацненне той пазіцыі, якую мы адчулі ў Беларусі даўно», — адказаў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне, ці не з'явіліся ў сувязі з гэтым для краіны новыя рызыкі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што свет цяпер шалёна мяняецца і пастаянна з'яўляюцца або знікаюць тыя ці іншыя рызыкі. «Рызыкі для кагосьці новыя з'явіліся — гэта дакладна. Але не для нас», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнта таксама спыталі, які пратакол прыняцця рашэння ў выпадку, калі давядзецца прымяняць ядзерную зброю. «Слухайце, нават калі б мы, як Паўночная Карэя, мелі зброю, выробленую і створаную ў сябе, ніколі ў жыцці ні адна краіна не прымяніла б яе самастойна без кансультацыі са сваімі саюзнікамі. А тым больш нам без кансультацыі з Расійскай Федэрацыяй, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі, не дай бог (як Пуцін казаў, вы задалі пытанне — я адказваю), таму што бразгаць гэтай зброяй — гэта сур'ёзная справа... Але калі б раптам, то, натуральна, мы б не проста пракансультаваліся, мы б вельмі сур'ёзна правялі перамовы з Прэзідэнтам Расіі па прымяненні гэтай зброі».

Як было адзначана ў яшчэ адным пытанні ад журналіста, расійская ядзерная дактрына цяпер прадугледжвае ў тым ліку адказ ядзерным ударам нават у тым выпадку, калі па тэрыторыі Саюзнай дзяржавы — Расіі і Беларусі — прымяняецца няядзерная зброя, але ёсць пагроза суверэнітэту. Дзе ў гэтым выпадку для Аляксандра Лукашэнкі праходзіць чырвоная лінія? «Граніца дзяржаўная. Мы ўжо аб гэтым сказалі ясна і дакладна. Калі нехта перасякае нашу дзяржаўную граніцу, мы будзем усё рабіць для прымянення ўсёй зброі, якая ёсць у Беларусі», — адказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў журналістам у Крамлі некаторыя заклікі «гарачых галоў» ва Украіне аб неабходнасці ваеннага ўварвання ў Беларусь.

«Ну, няхай паспрабуюць. Мы іх чакаем. Але я вам павінен сказаць, што калі нехта, як я кажу, і вякае, то гэта людзі, якія абсалютна не прымаюць ніякіх рашэнняў. Гэта проста вякане звычайнае. І ніхто з сур'ёзных людзей, нават на ўзроўні прэзідэнта Зяленскага, не думае пра тое, што трэба зайсці ў Беларусь. Гэта галаўны боль вельмі сур'ёзны, які прывядзе да краху наогул у ваенных адносінах кіеўскія ўлады. Гэта проста вякане тых людзей, якія ні за што не адказваюць. Яны могуць казаць што заўгодна. Мы адносна гэтага абсалютна спакойныя», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што беларускі бок не ўтойвае, што падтрымлівае пэўныя кантакты з украінскімі ўладамі: «Няхай яны мінімальныя, але па тых каналах, якія дапамагаюць нам, расіянам абменьвацца ваеннапалоннымі, кантакты падтрымліваць на гуманітарным узроўні. Гэта нармальныя кантакты. Мы тут разам працуем з расіянамі».

«Таму з любога боку, з любых пазіцый — улезці ў Беларусь такім чынам, паўтары тысячы кіламетраў граніца, украінцам гэта дакладна не трэба», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падзяліўся з журналістамі падрабязнасцямі таго, што абмяркоўвалася напярэдадні ў час сумеснай вячэры і нефармальнай размовы з лідарамі краін СНД.

«Добрая была вячэра», — сказаў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што ўдалося абмеркаваць усе пытанні. «Ад геапалітыкі да канкрэтных унутраных пытанняў. Але галоўнае — давайце будзем разам», — дадаў ён.

Па просьбе журналістаў Аляксандр Лукашэнка таксама падзяліўся некаторымі падрабязнасцямі наконт таго, які падарунак ён уручыў Прэзідэнту Расіі на дзень нараджэння.

«Вельмі сур'ёзны падарунак, які стварылі нашы ўмельцы. Думаю, гэта вы ва Уладзіміра Уладзіміравіча спытаеце. Ён (падарунак. — **«Зв.»**) арыгінальны і асаблівы. Я не хачу казаць. Вельмі сур'ёзны падарунак, створаны рукамі беларусаў, якія добра ставяцца не толькі да Расіі, але і асабіста да Прэзідэнта Расіі. Думаю, ён вам можа паказаць. Вам спадабаецца», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Дзмітрый КРУТОЙ:

# «Гэта адзін з паспяховых праектаў паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны»

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ацаніў эканамічны і турыстычны патэнцыял Слаўгарадскага раёна

**Праграма рабочага візіту вышэйшай службовай асобы ўключала наведванне прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад», дзе, згодна з праграмай «адзін раён — адзін праект», паспяхова працуе інавацыйная вытворчасць кандытарскіх вырабаў. Тут выпускаецца імпартазамяшчальны і экспартаарыентаваны прадукт — мармелад на любы густ: з вітамінамі, дыябетычны (для асоб, якія аддаюць перавагу нізкавугляродным прадуктам харчавання), для харчавання пры інтэнсіўных фізічных нагрузках, а таксама жэлейныя кандытарскія вырабы з выкарыстаннем мадыфікаваных крухмалаў, на аснове айчыннай біялагічна каштоўнай раслiннай сыравіны.**



На прадпрыемстве створана 115 новых працоўных месцаў. Праект рэалізаваны з дзяржпадтрымкай, забяспечанай указамі Прэзідэнта № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці» і № 177 «Аб мерах па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці». Асноўная доля экспарту прыходзіцца на Расію. Прадукцыя таксама пастаўляецца ў Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Арменію, Малдову, Грузію, Туркменістан, Балгарыю.

— Гэта адзін з нешматлікіх праектаў, які выйшаў на поўную магутнасць і пачаў разлічвацца па ўсіх фінансавых абавязацельствах, — адзначыў падчас наведвання прадпрыемства кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. — На сёння ён з'яўляецца, напэўна, самым яркім прыкладам паспяховасці нацыянальнай праграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. Хацелася б, каб такіх праектаў было больш.

На першым этапе рэалізацыі праграмы былі сумненні ў тым, як спрацуюць прадугледжаныя ёй падатковыя, жыллёвыя і фінансавыя меры, прызнаўся Дзмітрый Крутой. У Слаўгарадзе ўсё атрымалася ў комплексе.

«Таму што рэсурсы выдзяляліся з некалькіх крыніц, — мяркуе кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Гэта рэспубліканскія інавацыйныя фонды — улічваючы, што прадукцыя была інавацыйнай; інавацыйны фонд вобласці і непасрэдна грошы банка. Напачатку здавалася, што кошт праекта вялікі і не атрымаецца скласці фінансавую мадэль вяртання гэтых інвестыцый. Ва ўказе прапісана: увод аб'екта ў эксплуатацыю — 20 працэнтаў выдаткаў вяртаецца, выхад на праектную магутнасць на працягу трох гадоў — яшчэ вяртаем 20 працэнтаў. І цяпер крэдытная нагрузка, якая засталася — 15 мільёнаў рублёў, — дазваляе акупіць гэты праект з улікам выхаду на праектную магутнасць. Сёлета прадпрыемства плюсуе яшчэ 10 працэнтаў да максімальных аб'ёмаў, якія магчымыя на дадзеным абсталяванні, што дазваляе акупіць праект за 7-8 гадоў».

Кіраўніцтву прадпрыемства трэба думаць над наступным этапам, звяртае ўвагу Дзмітрый Крутой: «Або тут пашыраць магутнасці, або побач будаваць такі ж аб'ект. Важна тое, што створана 115 рабочых месцаў і работнікі ў асноўным ураджэнцы Слаўгарада. Яны прайшлі навучанне на галаўным прадпрыемстве ў Бабруйску і вярнуліся сюды працаваць. І, што важна, атрымалі арэнднае жыллё. Заканадаўства дазваляе тым, хто адпрацаваў 10 гадоў, выкупіць яго за 10 працэнтаў кошту. Сёння гэтая вытворчасць — палова прамысловай вытворчасці ўсяго Слаўгарадскага раёна».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама азнаёміўся з вынікамі ўзбуйнення сельгасарганізацый у раёне. Слаўгарадчына трапіла ў праграму эксперыментальнага ўзбуйнення шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый.

— Сёння яны паказалі свае першыя фінансавыя разлікі, — адзначыў Дзмітрый Крутой у размове з журналістамі. — На працягу месяца-двух мы іх дапрацуем, паглядзім, якія прэферэнцыі і льготы патрэбны ад дзяржавы. Па агульнаму разліку за наступную пяцігодку тры галіны — турыстычная, аграпрамысловая і харчовая перапрацоўка — павінны выцягнуць эканоміку раёна, прыпыніць адток насельніцтва — ён ужо стаў меншы практычна ў два разы.

Спікер звярнуў увагу на тое, што ў краіне адбываецца ўзбуйненне сельгаспрадпрыемстваў, памяншэнне колькасці работнікаў за кошт механізацыі і аўтаматызацыі працэсаў.

— Гісторыя будзеісці эвалюцыйна. Прэзідэнт перасцерагае ад рэзкіх эксперыментаў або выпрацоўкі адзіных падыходаў да ўсёй краіны, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі. — Усё гэта патрабуе вельмі сур'ёзнай падрыхтоўкі. Там, дзе з'явіліся моцныя прадпрыемствы-інтэгратары, яны гатовы ўзяць дадатковыя землі, жывёлу, жывёлагадоўчыя аб'екты. Ёсць такія добрыя прыклады, як аграхолдынг «Дзяржынскі», «Савушкін прадукт». Гэта нашы нацыянальныя чэмпіёны. На прыкладзе сярэдніх і невялічкіх раёнаў дадзены працэс трэба будзе яшчэ суправаджаць у ручным рэжыме, але гэта цалкам спакойная, эвалюцыйная работа.

Па словах **першага намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргея САВІЦКАГА,** рэфармаванне сельскагаспадарчых арганізацый шляхам узбуйнення праводзіцца на прыкладзе трох раёнаў — Слаўгарадскага, Клічаўскага і Чэрыкаўскага. У Слаўгарадскім раёне першыя крокі ўжо зрабілі, на старце — Чэрыкаў і Клічаў, па іх ёсць пэўныя планы.

У Слаўгарадскім раёне з 10 сельскагаспадарчых арганізацый цяпер засталося шэсць, а ў планах — пакінуць чатыры. Адзін са станоўчых вынікаў — аптымізацыя кадраў. Для вялікай колькасці дробных сельгасарганізацый значная праблема — знайсці дастатковую колькасць спецыялістаў (заатэхнікаў, ветэрынараў, аграномаў...). Акрамя гэтага, у невялікіх гаспадарках немагчыма забяспечыць дастойны ўзровень аплаты працы. Узбуйненне дасць магчымасць прыцягнуць дадатковыя рэсурсы.

Напрыканцы візіту кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ацаніў турыстычны патэнцыял раёна. Жамчужынай Слаўгарадчыны называюць Блакітную крыніцу, якая знаходзіцца на левабярэжным баку ракі Сож. Штогод 14 жніўня сюды прыязджаюць тысячы паломнікаў на свята Макавей. Са старажытных часоў крыніца шануецца ў народзе як святая і гаючая. Каля яе знаходзіцца невялікая капліца і ўстаноўлены паклонны крыж. З ёй звязана шмат легенд і паданняў. З 2010 года ў Слаўгарадскім раёне рэалізоўваецца праект па вытворчасці дамашніх сыроў. Сёння гэтай дзейнасцю займаецца каля 40 сем'яў. Таксама тут рэалізоўваюцца розныя іншыя формы самазанятасці: рамесніцтва, пчалярства і іншыя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Слаўгарадскі раён.*

Будзьце ў курсе

## ПЕРАЛІК ТЭРАРЫСТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

*Публікуецца згодна з пастановай Савета Міністраў № 1061 ад 19 жніўня 2006 г.*

| Найменне | Рэгістрацыйны нумар і дата рэгістрацыі | Найменне рэгістрацыйнага органа | Месца знаходжання (юрыдычны адрас) | Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка, галоўнага бухгалтара або іншай упаўнаважанай службовай асобы | Дата ўступлення ў сілу рашэння Вярхоўнага Суда |
|---|---|---|---|---|---|
| Атрады грамадзянскай самаабароны Беларусі (АГСБ) | Нефармальная арганізацыя | Звесткі адсутнічаюць | Звесткі адсутнічаюць | Звесткі адсутнічаюць | 18.08.2021 |
| «Супраціў» з уваходнымі ў яе ініцыятывамі: «Кібер-Партызаны», «Дружыны Народнай Самаабароны — ДНС» і «Буслы ляцяць» | Нефармальная арганізацыя | Звесткі адсутнічаюць | Звесткі адсутнічаюць | Звесткі адсутнічаюць | 01.12.2021 |
| «NEXTA» з уваходнымі ў яе структурнымі падраздзяленнямі: «NEXTA Live» і «LUXTA» | Нефармальная арганізацыя | Звесткі адсутнічаюць | Рэспубліка Польшча | Звесткі адсутнічаюць | 08.04.2022 |
| «BYPOL» з уваходнымі ў яе структурнымі падраздзяленнямі «Сітуацыйна-аналітычны цэнтр» і «Мабілізацыйны план «Перамога» | Нефармальная арганізацыя | Звесткі адсутнічаюць | Рэспубліка Польшча | Звесткі адсутнічаюць | 30.08.2022 |
| «Полк імя Кастуся Каліноўскага» з уваходнымі ў яе структурнымі падраздзяленнямі: «Батальён «Волат», «Батальён «Літвін», «Батальён «Western», «БПЛА імя Мікіты Крыўцова», «Атрад АТОМ», «Танга-Ромео», «Мабілізацыйны цэнтр фонду «Беларускі Дом у Варшаве», «Рух «Каліноўцы» | Нефармальная арганізацыя | Звесткі адсутнічаюць | Рэспубліка Польшча, Украіна | Звесткі адсутнічаюць | 25.09.2024 |

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дзеючы прэзідэнт Туніса перамог на выбарах

Кайс Саід перамог на выбарах, што адбыліся ў краіне ў нядзелю, набраўшы 90,69 працэнта галасоў. Аб гэтым заявіў кіраўнік вышэйшай незалежнай выбарчай камісіі краіны Фарук Буаскар падчас прэс-канферэнцыі, якую трансліравалі туніскія тэлеканалы, паведаміла РІА «Новости». Такім чынам, Саід, які знаходзіцца на пасадзе прэзідэнта Туніса з 2019 года, пераабраны на другі тэрмін і будзе займаць гэтую пасаду яшчэ пяць гадоў. Два іншыя кандыдаты — бізнесмен Аяшы Замель і лідар левай партыі «Народны рух» Зухейр аль-Магзауі — набралі адпаведна 7,35 і 1,97 працэнта.

### Кім Чэн Ын заявіў, што КНДР не імкнецца да вайны з Паўднёвай Карэяй



Лідар КНДР заявіў, што Паўночная Карэя не імкнецца да вайны з Паўднёвай Карэяй, але і не лічыць больш актуальнай ідэю аб'яднання дзвюх краін, будзе ўзмацняць ядзерную абаронную гатоўнасць да максімальных вышынь дзеля захавання стратэгічнага балансу сіл у рэгіёне. Аб гэтым паведаміла Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва (ЦТАК). «Насамрэч Паўднёвая Карэя можа жыць бяспечна, калі яны не будуць нас правакаваць і паказваць сваю сілу», — заявіў Кім Чэн Ын у сваёй прамове падчас візіту ва ўніверсітэт нацыянальнай абароны. Ён падкрэсліў, што праблема заключаецца ў тым, што другі бок працягвае «правакаваць» КНДР. Кім Чэн Ын заклікаў уважліва сачыць за бягучым становішчам, бо ЗША і іх «марыянеткі ў Паўднёвай Карэі» імкнуцца ўзмацніць свае ваенныя магчымасці, што нясе рызыку парушэння балансу сіл на Карэйскім паўвостраве.

# ЧАС РАБІЦЬ ЗАПАСЫ





## ІНАВАЦЫЙНЫЯ САРТЫ

Вытворчасць сельгаспрадукцыі — найважнейшая галіна эканомікі нашай краіны, якая забяспечвае харчовую бяспеку і экспартны патэнцыял. Пладаводства і агародніцтва, а таксама бульбаводства развіваюцца ў адпаведнасці з мерапрыемствамі дзяржаўнай праграмы «Аграрны бізнес» на 2021—2025 гады, стратэгіяй развіцця цяплічнага агародніцтва Беларусі на 2023—2027 гады, іншымі дзяржаўнымі навукова-тэхнічнымі праграмамі, мерапрыемствамі і комплексамі мер, расказала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства, начальнік упраўлення бульбаводства, плодаагародніцтва, аграхіміі і аховы раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ.** Яна адзначыла, што ў Беларусі створана буйнатаварная вытворчасць плодаагароднінай прадукцыі, прычым асноўныя аб'ёмы гэтай вытворчасці — больш за 60 % — сканцэнтраваны менавіта ў грамадскім сектары, у спецыялізаваных арганізацыях. Спецыяліст падкрэсліла, што адзначаецца тэндэнцыя да павелічэння аб'ёмаў вытворчасці бульбы і плодаагароднінай прадукцыі ў сялянскіх і фермерскіх гаспадарках.

— Доля прадукцыі, што вырабляецца ў гэтай катэгорыі гаспадарак, у агульным аб'ёме вытворчасці грамадскага сектара краіны складае па бульбе, пладах і ягадах па 50 %, а па агародніне — больш за 70 %.

Са свайго боку вучоныя імкнуцца даць аграрыям больш магчымасцяў, удасканальваючы сартавы склад сельгаскультур.

— У Дзяржаўны рэестр сартоў для прамысловай апрацоўкі ўключана 184 сарты бульбы, у тым ліку 46 айчыннай селекцыі рознага мэтавага прызначэння для прыгатавання бульбы фры, чыпсаў, замарожанай, гарнірнай бульбы, — паведаміла Таццяна Карбановіч.

У Дзяржрэестр таксама ўключана больш за тры тысячы сартоў і гібрыдаў агароднінных і бахчавых культур, з іх 302 —- айчыннай селекцыі, і 460 сартоў пладовых і ягадных культур, з якіх 342 — зноў жа айчыннай селекцыі, канкрэтызавала спікер.

Адно з найважнейшых пытанняў на парадку дня — хуткае раяніраванне сартоў сельскагаспадарчых раслін айчыннай і замежнай селекцыі (раяніраванымі называюць сарты, прыдатнасць якіх да вырошчвання ў канкрэтным рэгіёне навукова праверана і пацверджана). Такім чынам, у вытворчы працэс будуць аператыўна ўключацца найбольш інавацыйныя і запатрабаваныя сарты, якія хутчэй дойдуць да спажыўца, падкрэсліла яна.

— Гэта адно з даручэнняў па выніках наведвання кіраўніком дзяржавы фермерскай гаспадаркі «Спартан-Агра». У рамках дзяржаўнага сортавыпрабавання нам трэба будзе гэтую работу выканаць, унесці адпаведныя змяненні і дапаўненні ў заканадаўства, — сказала Таццяна Карбановіч.

Многае зроблена ўжо сёння: пашыраны асартымент агароднінных культур, якія вырошчваюцца ў краіне, да 40 найменняў, пладова-ягадных — да 30. Шырока вырошчваюцца ў Беларусі семечкавыя і костачкавыя пладовыя культуры, а агароднінная прадукцыя апрацоўваецца як у адкрытым, так і ў абароненым грунце.

## ГАРАЧАЯ ПАРА

Але толькі вырасціць якасную сельскагаспадарчую прадукцыю недастаткова, важны ўвесь тэхналагічны ланцужок. І наступныя яго этапы — своечасова сабраць ураджай і без страт захаваць. У цэлым, з пачатку года (за 9 месяцаў) Белкаапсаюз закупіў сельгаспрадукцыі на больш за 390 млн рублёў, адзначыла **начальнік упраўлення нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.** Насельніцтву нарыхтоўшчыкі Белкаапсаюза выплацілі за здадзеную сельгаспрадукцыю сёлета парадку 240 млн рублёў.

Гэтая работа працягваецца: восень — гарачая пара для нарыхтоўшчыкаў.

— Нарыхтоўчая галіна вельмі дэталёва працуе з насельніцтвам, — адзначыла начальнік упраўлення Белкаапсаюза. — Мы прывіваем культуру догляду прысядзібных участкаў, стымулюем вырошчванне культур. Арганізацыі спажывецкай кааперацыі праводзяць у тым ліку палітыку прасоўвання ўнікальнай, нетрадыцыйнай беларускай прадукцыі. Такім кірункам сталі некалі беларускія кавуны, якія сёння прысутнічаюць на прылаўках. Насельніцтва ведае іх смак. Ужо вырошчваюць грэцкія арэхі на прысядзібных участках. Тыя ж буякі, якія мы ўводзілі калісьці як «эксклюзіўныя ягады» і яны прадаваліся на вагу золата, сёння прысутнічаюць на дачных участках і сталі традыцыйнымі, даступнымі. Немалаважную ролю ў гэтым адыграла і спажывецкая кааперацыя.

Арганізацыі спажыўкааперацыі — гэта не толькі нарыхтоўчая дзейнасць, але і перапрацоўка, гандаль, грамадскае харчаванне. Але нарыхтоўкі для Белкаапсаюза — ключавы кірунак. Валодаючы шырокай сеткай прыёманарыхтоўчых пунктаў (іх 760), Белкаапсаюз закупляе ў насельніцтва як сельгаспрадукцыю, так і дары лесу — такім чынам лясныя грыбы і ягады трапляюць і на прылаўкі, і на перапрацоўку, на ўнутраны рынак і на экспарт. У актыве арганізацыі — 107 рынкаў, якія не толькі прапаноўваюць гандлёвыя месцы, але і арганізоўваюць нарыхтоўчую і гандлёвую дзейнасць, падкрэсліла Аксана Скіндэр.

— Пытанне якасці ў сістэме спажывецкай кааперацыі на ўзмоцненым кантролі, — паведаміла яна. — У нас прысутнічае ўвесь спектр сартавога складу, мы зацікаўлены, каб самы шырокі асартымент прапанаваць у міжсезонны перыяд. Актыўна працуем і з сельгасвытворцамі. З году ў год заключаем дагаворныя адносіны з дзвюма сотнямі фермераў. Гэта спецыялізаваныя сельгасарганізацыі, якія вырошчваюць пэўныя культуры, пэўныя сарты і прапаноўваюць гэту прадукцыю ў міжсезонны перыяд.

Ёсць у Белкаапсаюза і свая база для захоўвання і стварэння стабілізацыйных фондаў. Сёлета ў фарміраванні стабфондаў будуць ўдзельнічаць 41 сховішча Белкаапсаюза.

— Плануем закласці не менш як 5 тысяч тон сельскагаспадарчай прадукцыі: гэта бульба, агародніна ў асартыменце (капуста, буракі, морква і цыбуля), яблыкі. Прадукцыя праходзіць узмоцнены адбор па якасці, таму што павінна захавацца ў таварным выглядзе да мая—чэрвеня.



## БРУСНІЦЫ, ПАТЫСОНЫ, ХАЛАПЕНЬЁ...

Аб нарыхтоўках на зіму восенню думаюць не толькі гаспадыні, але і перапрацоўшчыкі: сёлета прадпрыемствы кансервавай галіны зрабілі акцэнт на ягады, павялічыўшы нарыхтоўку малін, чарніц, буякоў і брусніц. Як расказала **галоўны спецыяліст аддзела аграпрамысловай інтэграцыі і нарыхтовак сельскагаспадарчай сыравіны канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Алена АНДРЭЕВА,** штогод для перапрацоўкі нарыхтоўваецца каля 150—170 тысяч тон сыравіны, з якіх плады і ягады складаюць 100—115 тысяч тон (90—100 тысяч тон з гэтага — беларускія яблыкі). Палова пладова-ягаднай прадукцыі адпраўляецца на кансерваванне, палова — на вінаробныя прадпрыемствы. Нарыхтоўваецца і гародніна, сказала Алена Андрэева, штогод каля 50—55 тысяч тон.

Спецыяліст падкрэсліла: для кожнага віду кансервавання або апрацоўкі да сыравіны прад'яўляюцца розныя патрабаванні, яны адрозніваюцца, напрыклад, для вытворчасці дзіцячага харчавання і хутказамарожанай прадукцыі, фруктовых напаўняльнікаў або кансерваў. Менавіта таму ў перапрацоўчых прадпрыемстваў створаны сумесна з сельгасарганізацыямі, фермерскімі і сялянскімі гаспадаркамі сыравінныя зоны па пладова-ягаднай і агароднінай сыравіне.

— Практычна чвэрць арганізацый кансервавай галіны мае ўласныя сыравінныя зоны. Гэта дзевяць арганізацый краіны. У вінаробстве такіх зон менш: з 20 арганізацый сыравінныя зоны маюць тры, — распавяла спецыяліст.

Прычым вырошчваюцца ў такіх сыравінных зонах не толькі найбольш запатрабаваныя віды гародніны і садавіны — яблыкі, буракі, морква і гэтак далей. Ёсць і такія культуры, як шчаўе, цукровая кукуруза, зялёны гарошак, бружмель, буякі, чырвоная і чорная парэчка, агрэст.

— Вядзём пастаянную работу па закупцы сыравіны ў насельніцтва як праз свае стацыянарныя прыёмныя пункты, так і шляхам прыёмкі сыравіны ад нарыхтоўчай сістэмы спажывецкай кааперацыі. У 2023 годзе з уласных сыравінных зон кансервавых заводаў узялі на перапрацоўку каля 20 % усяго аб'ёму нарыхтаванай кансервавай сыравіны, — адзначыла спікер.

У цэлым, сёння на прамысловую перапрацоўку накіроўваецца больш за 45 відаў беларускай сельгаспрадукцыі, у тым ліку яблыкі, грушы, слівы, алыча, вішні, вінаград, розныя віды садовых і дзікарослых ягад, шэраг агароднінных культур, спаржавая фасоля, шчаўе, шпінат, спаржа. Гэты год ураджайны на ягады, і перапрацоўчая галіна не магла не адрэагаваць:

— Нядрэнна ў гэтым годзе мы спрацавалі па маліне: да фактычных аб'ёмаў нарыхтоўкі па мінулым годзе гэта 112 %. Чарніцы — 156 %, буякі — 142 %. Брусніц нарыхтавалі ў 4 разы больш, чым летась.

Выраслі сёлета і аб'ёмы нарыхтовак па іншых пазіцыях.

— Карыстаецца попытам перапрацаваная прадукцыя з выкарыстаннем патысонаў. Мы іх нарыхтавалі ў 2,5 раза больш, чым летась. Баклажан беларускі — 144 %. Ну, і традыцыйныя кабачкі, гарбузы. З апярэджаннем да ўзроўню мінулага года ідзе сёлета нарыхтоўка ягад і яблыкаў, — праінфармавала прадстаўнік «Белдзяржхарчпрама».

Згодна са стратэгіяй развіцця кансервавай галіны, штогод перапрацоўшчыкі павінны нарыхтоўваць сыравіну ў аб'ёме 80 тысяч тон.

— Мы ўжо прынялі на перапрацоўку 64 тысячы тон сыравіны, — сказала Алена Андрэева. — Працягваем масавую нарыхтоўку яблыкаў, якую будзем весці практычна да канца года. Вядзём нарыхтоўку гарбузоў. Наперадзе нарыхтоўка халадаўстойлівых агароднінных культур.

Зразумела, у першую чаргу важна перапрацаваць тое, што вырасла на нашых палях і агародах, але выкарыстоўвае галіна і сыравіну, якая ў Беларусі не вырабляецца (апельсіны, лімоны, ківі, ананасы, манга, аліўкі і г. д.). Дарэчы, сёлета ў спісе сыравіны, якая перапрацоўваецца кансервавымі прадпрыемствамі, з'явіліся новыя пункты — гэта каперсы, перац халапеньё і перац «Мексіканец».

## ЗДЗІВІЦЬ СПАЖЫЎЦА

Усяго ў Беларусі перапрацоўкай плодаагароднінай прадукцыі займаецца 29 прадпрыемстваў, якія маюць спецыялізаваныя магутнасці, расказала **начальнік упраўлення па вытворчасці прадуктаў харчавання канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Юлія АЛЯХНО.** Чатыры з іх — у складзе «Белдзяржхарчпрама», прычым два займаюцца вытворчасцю дзіцячага харчавання.

— Сёння ёсць патрэба ў шматкампанентных соках, дзіцячым харчаванні, — адзначыла начальнік упраўлення. — Імкнёмся здзівіць нашых спажыўцоў — і маленькіх, і дарослых. Распрацоўваем новыя рэцэптуры, новыя віды прадукцыі. Шырокую лінейку сокаў вырабляем на аснове бярозавага.

Спікер падкрэсліла: прадпрыемствы канцэрна пастаянна мадэрнізуюцца, у іх цэхах устаноўлена найноўшае абсталяванне. І ў цэлым, кансервавая галіна нашай краіны прапануе спажыўцу найшырэйшы асартымент высакаякаснай прадукцыі.

— Вырабляем вельмі шырокі асартымент і ўжо дайшлі да перапрацоўкі халапеньё, каперсаў і гэтак далей. Прадпрыемствы імкнуцца вырабіць і марынаваныя слівы, і спаржу марынаваную, здзівіць хоць нечым нашага патрабавальнага спажыўца, — адзначыла яна. — Удзяляем увагу і дзіцячаму харчаванню. Пашыраем лінейку сокавай прадукцыі з паніжаным утрыманнем цукру, солі для дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту. Вырабляем таматныя соусы, каб разнастаіць асартымент школьных сталовых, кактэйлі фруктова-малочныя, у тым ліку на аснове раслінай сыравіны. Цяпер папулярнае раслінае малако, мы асвоілі вытворчасць і актыўна прасоўваем, прапаноўваем сеткам для рэалізацыі. Пашырылі лінейку дзіцячых плодаагароднінных пюрэ для дашкольнага харчавання — «перакус на раз» у пакаванні тэтрапак. Дзіця ўзяло з сабой у партфель, перакусіла карысным. З навінак прадпрыемства —сокі прамога адцісkання — мандарынавы, гранатавы, таматны, грэйпфрутавы.

Усё гэта, з аднаго боку, — імпартазамяшчэнне, з другога — экспартна-арыентаваная прадукцыя, падсумавала спецыяліст.

— Каля 41 % у аб'ёмах нашай рэалізацыі на сёння — гэта экспарт. Асноўны рынак — Расійская Федэрацыя, але нашы прадпрыемствы рэалізоўваюць прадукцыю ў Ізраіль, Казахстан, Узбекістан, Арменію, Грузію.

Наладжаны пастаўкі ў КНР, дзе беларускі бярозавы сок карыстаецца вялікім попытам, дадала эксперт. Дзіцячае харчаванне беларускай вытворчасці таксама паступова заваёўвае давер кітайскіх спажыўцоў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дыялог з чытачом

# Хваробы залежаць... ад нас саміх

**У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшла прэзентацыя новага выдання ад «Звязды». Зацікаўленыя чытачы прыйшлі на сустрэчу з аўтарам кнігі «Ілюзія ведання: як не стаць закладнікам хваробы» доктарам Гарбанніджадам Гуменам Гушангам.**





Месца для імпрэзы, для грунтоўнай размовы пра суадносіны чалавека з медыцынай, пра тое, як абараніць наша здароўе ад розных дзейсных знешніх уплываў невыпадкова было абрана ў літаратурным музеі. Народны песняр Беларусі Якуб Колас праз усё сваё жыццё сябраваў з прадстаўнікамі гэтай найважнейшай прафесіі.

Адна з супрацоўніц музея — загадчык навукова-асветніцага аддзела Вольга Наважылава расказвае: «...Варта заўважыць, што здароўем народнага паэта займаліся найлепшыя дактары, яго сучаснікі — Даніла Маркаў, Сяргей Ліяранцэвіч, Давід Абрамовіч, Міліца Дашкевіч, Мікалай Бобрык, Барыс Трусевіч і іншыя. Ім Колас быў бязмерна ўдзячны, прысвячаў вершы. У 2020 годзе фонды музея папоўніліся рукапісамі пісьмаў Якуба Коласа міністру аховы здароўя БССР Івану Анісімавічу Інсараву, якія перадала ў музей дачка апошняга Наталля Іванаўна. У лістах, зваротах да высокай службовай асобы Канстанцін Міхайлавіч не за сябе просіць, ён просіць дапамагчы самім дактарам!.. У знак удзячнасці Якуб Колас дарыў дактарам вершы, кнігі з дароўнымі надпісамі. Напрыклад, доктару Давіду Абрамовічу ўручыў паэму «Рыбакова хата»... Захаваўся і такі «медыцынскі» аўтограф народнага паэта: «Дарагому Мікалаю Іванавічу Бобрыку на памяць ад удзячнага пацыента. Якуб Колас. 7. ІІІ. 1955 г.». Гэты надпіс — хірургу, які выратаваў паэта, прадоўжыў яго жыццё на некаторы адрэзак часу, — на зборы твораў...»

Танальнасць размове на прэзентацыі, якая адбылася ў музеі, задала прывітальным словам дырэктар Коласаўскага дома Ірына Мацяс. А вядучай імпрэзы выступіла вядомая ў краіне тэлевізійная журналістка, дыктар АНТ Кацярына Тумас-Цішкевіч, якая працуе і як пішучы журналіст. Яна неадноймы рабіла самыя адметныя інтэрв'ю з аўтарам кнігі (некаторыя з іх змешчаны і ў кнізе «Ілюзія ведання...»). Кацярына адзначыла маштаб асобы аўтара кнігі, яго генератыўнасць, здольнасць да адкрыцця новых тэматычных абсягаў. Мо таму і з'явілася гэта кніга, як плён выступленняў доктара Гумена ў друку, найперш — у выданнях, што маюць дачыненне да Выдавецкага дома, — у парламенцкай і ўрадавай газеце «Звязда», у сеткавым выданні zviazda.by, у часопісах «Алеся» і «Беларусь». Літаральна дзясяткі інтэрв'ю з аўтарам выданні падрыхтавала журналістка Алена Кравец. Яны ў большасці сваёй і склалі аснову кнігі. Дзякуючы дапамозе сваіх калег па падрыхтоўцы публікацый Гарбанніджад Гумен Гушанг здолеў за гады сваёй супрацы са «Звяздой» выбудаваць такі даверлівы фармат зносін з чытацкай аўдыторыяй, што яго публікацыі выклікаюць найбольшую ўвагу, наведвальнасць на розных рэсурсах, да іх цягнуцца чытачы ў сацыяльных сетках, іх заўважылі літаральна ва ўсім свеце (тэксты дасведчанага медыцынскага спікера змяшчаюцца на беларускай, рускай, англійскай і кітайскай мовах). Мяркуйце па назвах некаторых матэрыялаў: «Чаму мужчыны адрозніваюцца ад жанчын на ўзроўні фізіялогіі і псіхалогіі»; «Хочаш быць маладой, прыгожай і здаровай — не нервуйся»; «Болей рухацца, болей думаць: як не састарыцца зараней»; «Чаму мы падманваем і ці так ужо патрэбны наш падман?»; «Ці можна вылечыць аўтызм?»; «Каханне. Усяго толькі гульня гармонаў ці вялікае пачуццё?»; «Чаму нас лёгка падмануць? Як мы пагаджаемся на тое, што нам не вельмі патрэбна?»; «Наколькі мы выкарыстоўваем наш мозг і чаму нам цяжка думаць»; «Што ўплывае на наш інтэлект і якія памылковыя высновы прыводзілі да трагедый?»; «Памылкі, якія робіць наш мозг. Ці можна іх выправіць?»...

Шмат добрых слоў пра публіцыстычную актыўнасць Гарбанніджада Гумена Гушанга сказалі на сустрэчы ў Коласаўскім доме дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, вядомы арганізатар гаспадарчага жыцця, у ранейшым кіраўнік партыйных органаў, дзяржаўных прадпрыемстваў Мікалай Жураўскі, унучка народнага песняра Беларусі Якуба Коласа і класіка беларускай дзіцячай літаратуры Янкі Маўра Марыя Міхайлаўна Міцкевіч... Удзел у сапраўдным свяце навукова-публіцыстычнай кнігі прынялі многія вядомыя ў Коласаўскім доме і ўвогуле ў культурным, асветніцкім асяроддзі асобы — музейшчыца Наталля Адамовіч, паэт Рагнед Малахоўскі, дырэктар кнігарні «Акадэмкніга» Вольга Глухоўская... Дададзім, што Гарбанніджад Гумен Гушанг — член Беларускага саюза журналістаў. На прэзентацыі кнігі яму была ўручана Ганаровая грамата гэтага творчага саюза — як актыўнаму папулярызатару тэмы аховы здароўя чалавека на старонках айчынных медыя.

Прэзентацыя «Ілюзіі ведання...» паказала, што літаратуры падобнага характару не так і шмат. Што кніга павінна несці да чытача і адметныя мастацкія сюжэты, і развагі пра жыццё, а часам і няпростыя тэматычныя абсягі дзеля таго, каб шырэй развівалася мысленне, каб мы былі дзеяздольнымі ў няпростым супрацьстаянні з рознымі хваробамі часу.

Дарэчы, кнігу «Ілюзія ведання: як не стаць закладнікам хваробы» можна набыць ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне, а таксама ў Мінску ў кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: праспект Незалежнасці, 72. Добрага часу ў чытанні зборніка дыялогаў з доктарам Гарбанніджадам Гуменам Гушангам, новых адкрыццяў і супольных з аўтарам разваг пра здароўе, неабходнасць берагчы яго, увогуле пра жыццё ў свеце!



**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# САГРЭЦЦА — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ЗГАРЭЦЬ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На жаль, не ўсе рыхтуюцца да пахалодання загадзя — адкладаюць праверку ацяпляльнага абсталявання на потым, ігнаруюць планавы рамонт печаў. А хтосьці няправільна ўсё гэта эксплуатуе, грэбуе элементарнымі правіламі бяспекі. У выніку — пажары. На жаль, не абыходзіцца без ахвяр. Не выключэннем стаў і пачатак ацяпляльнага сезона гэтага года.

### ЗАСТАЎСЯ ТОЛЬКІ ПОПЕЛ...

Як паказвае практыка, пажаранебяспечныя сітуацыі ствараюць самі людзі. Часцей за ўсё вогненных надзвычайных сітуацый адбываюцца ў жыллёвым фондзе, і прычына іх банальная — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні (як правіла, у нецвярозым стане). Матэрыяльны ўрон часам вылічаецца дзясяткамі і сотнямі тысяч рублёў. Людзі губляюць тое, што нажывалася гадамі, доўга не могуць прывесці жыллё ў парадак.

Большасць такіх пажараў здараецца ноччу. Выяўленне пажару суседзямі адбываецца, калі дом практычна цалкам ахоплены агнём. Паведамленне ў дзяжурную службу МНС паступае вельмі позна, і чалавек, які знаходзіцца ўнутры дома, гіне.

У прыватнасці, 3 кастрычніка ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні дома ў вёсцы Чырвоная Змена Чэрвеньскага раёна. Пасля прыбыцця да месца выкліку падраздзяленняў МНС дом гарэў адкрытым полымем. На падлозе ў адным з пакояў было знойдзена абгарэлае цела грамадзяніна. Папярэдняя версія прычыны ўзнікнення пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні загінулага. У выніку пажару агнём знішчаны дах, пашкоджаны сцены і маёмасць па ўсёй плошчы жылога дома.

У той жа дзень трагедыя адбылася ў Уздзенскім раёне. Пажар успыхнуў у дачным доме. Пры разборцы будаўнічых канструкцый ратавальнікі выявілі абгарэлае цела сына гаспадыні. Прычына пажару, як мяркуецца, тая ж: неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні загінулага. Ад дачнага дома застаўся толькі попел.

За адны суткі — з 5 на 6 кастрычніка — на пажарах загінулі пяць чалавек. Трагедыі адбыліся ў Мінску, Віцебску, Бабруйскім, Нясвіжскім і Барысаўскім раёнах. Як правіла, сярод ахвяр — пажылыя людзі. Абставіны іх гібелі высвятляюцца. Акрамя таго, 6 кастрычніка мужчыну без прыкмет жыцця знайшлі ў лазні, якая згарэла. Надзвычайнае здарэнне адбылося ў Полацкім раёне. Пацярпелым аказаўся гаспадар падворка. Па факце праводзіцца праверка, высвятляецца прычына пажару. Разглядаецца версія неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні.

### ПАБЕЛЕНЫ КОМІН УКАЖА НА ПРАБЛЕМУ

Пагадзіцеся, пажар лягчэй папярэдзіць, чым аднаўляць яго наступствы. Аб тым, што нельга курыць у памяшканні, расказваецца яшчэ ў школе. Недакурак, які трапіў у ложак, можа выклікаць пажар за 120 секунд. Асаблівую ўвагу ў халоднае надвор'е трэба ўдзяляць сістэмам ацяплення. У катэгорыю рызыкі найперш трапляюць жыхары прыватнага жылога сектара.

«Абыякавасці не церпіць і печ: яна патрабуе рэгулярнага догляду, — звяртае ўвагу **начальнік сектара ўзаемадзеяння з грамадскасцю Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Алена НЕМАГАЙ**. — Расколіны і зазоры ў муры неабходна старанна замазаць глінай. Пажарную небяспеку ўяўляюць таксама расколіны ў комінах: яны — шчыліны для адкрытага полымя на гарышчы. Пабелены комін заўсёды ўкажа на магчымую праблему чарнатой».

Участак падлогі з гаручых матэрыялаў перад топачнай адтулінай павінен быць абаронены негаручым матэрыялам шырынёй не меней чым 0,5 метра і даўжынёй не меней чым 0,7 метра. Размяшчэнне гаручых рэчываў і матэрыялаў на ім не дапускаецца (напрыклад, складванне дроў). Мінімальная адлегласці ад паверхняў цеплагенеравальных апаратаў да гаручых рэчываў і матэрыялаў павінны выключаць загаранне гаручых рэчываў і матэрыялаў. Попел, вуглі і шлак, выдаленыя з цеплагенеравальных апаратаў, печаў, павінны быць праліты вадой да іх поўнага згасання. Пры распальванні печы ні ў якім разе нельга выкарыстоўваць гаручыя і лёгкія на ўзгаранне вадкасці.

Адна з распаўсюджаных прычын пажараў у ацяпляльны перыяд — перагрэў печы. «Бяздумна паліць у печы нельга, — папярэджвае Алена Немагай. — Каб пазбегнуць біды, лепш рабіць гэта двойчы за суткі, з некаторым інтэрвалам. І самае галоўнае — не пакідайце печ, якая паліцца, без нагляду».

### АЎТАНОМНЫ ПАЖАРНЫ АПАВЯШЧАЛЬНІК — ШАНЦ НА ЖЫЦЦЁ

Для таго каб пазбегнуць пажараў па прычыне няправільнай эксплуатацыі электраабсталявання, не выкарыстоўвайце няспраўныя выключальнікі, разеткі, аголеныя правады, а таксама самаробныя прыборы. З мэтай недапушчэння перагрузкі электрасеткі забараняецца аднachасова ўключаць некалькі магутных спажыўцоў электраэнергіі. Сачыце за спраўнасцю электраправодкі і давярайце яе мантаж толькі прафесіяналам.

Абавязкова адключайце электрапрыборы, сыходзячы з дому. Будзьце ўважлівыя пры эксплуатацыі электраабсталявання і своечасова арганізоўвайце яго рамонт. Звярніце ўвагу на зарадныя прылады планшэтаў, тэлефонаў і іншых гаджэтаў — ні ў якім разе не пакідайце іх у электрасетцы на ноч ці сыходзячы з дому: яны таксама нярэдка становяцца прычынай пажараў.

Не варта недаацэньваць магчымасці аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Як паказвае жыццё, там, дзе ўстаноўлены гэтыя невялікія прыстасаванні, удаецца пазбегнуць самых сумных наступстваў. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік адчувальны нават да нязначнага задымлення ў памяшканні, што спрыяе хуткаму выяўленню ўзгарання на ранняй стадыі. Пры з'яўленні дыму ён падае магутны гукавы сігнал, які здольны апавясціць і абудзіць чалавека, які спіць. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік рэкамендуецца ўсталёўваць у кожным жылым пакоі, у цэнтральнай частцы столі з невялікім зрушэннем у бок акна або дзвярэй — там, дзе забяспечаны пастаянны паветраабмен.

Выкананне правілаў пажарнай бяспекі зберажэ ваша жыццё і жыццё вашых блізкіх у перыяд ацяпляльнага сезона.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МНС.**

Даты

# СПРАВА, ЯКОЙ МЫ СЛУЖЫЛІ І СЛУЖЫМ

**...Верасень, кастрычнік шчодрыя на розныя святы, сярод якіх і мае любімыя Дзень маці, Пакровы, Сусветны дзень пошты.**

Прафесію паштальёна я выбрала для сябе яшчэ ў маладосці і аддала ёй амаль трыццаць гадоў жыцця. Праляцелі яны — як адно імгненне. І гэта пры тым, што работа была не з лёгкіх: свае тысячы кіламетраў — і ледзь не штодня — мне даводзілася намотваць і зімой, і летам, у любое надвор'е, прычым з досыць цяжкай сумкай (а то і дзвюма).

Што ў іх было? Тады — пенсіі, газеты, часопісы, пісьмы, паштоўкі, штонішто з тавараў на заказ... А ў асноўным — карэспандэнцыя: людзі ліставаліся, віншавалі адзін аднаго са святамі, шмат чыталі, выпісвалі газеты.

План я выконвала заўсёды. Толькі ў нашай раёнкі на маім участку было каля 130 падпісчыкаў, а ўсяго — каля сямісот. Для рэкламы новых выданняў альбо тых, што самой найбольш падабаліся, я трымала іх у сумцы — паказвала і расказвала, пакідала вяскоўцам пачытаць. Сярод вось гэткіх, маіх «любімчыкаў», былі часопісы «Работніца і сялянка» (потым «Алеся»), «Гаспадыня», газета «Звязда». У хаце Рамуальды Фурманавай, Ніны Насевіч, Алы Ліпай, Леаніда Цыбульскага, Вікенція Нічыпаровіча можна было не пытацца, што ім выпісваць... «Звязда», казалі, — гэта святое!

Заўсёды чыталі яе і мы з гаспадаром, хоць адкуль, здавалася б, час: дома трое дзяцей, «соткі», гаспадарка...

Але ж не: калі нечым сапраўды цікавішся, то час знойдзеш! У маім выпадку не толькі для таго, каб нешта пачытаць (пажадана — па-беларуску), але і... напісаць. Спачатку гэта былі вершы, потым — гумарэскі, «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на звяздоўскі «провад».

Незабыўныя ўражанні ад першых публікацый, ад зносін з харошымі людзьмі, ад павагі з боку непасрэднага кіраўніцтва. Неадночы я была пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва, атрымлівала граматы, грашовыя прэміі...

Гэта праўда: не заўважыла, як праляцелі гады, як выйшла на заслужаны адпачынак. Але ж па-ранейшаму часцяком бываю на сваёй, можна сказаць, роднай пошце, параўноўваю тое, што было пры мне, з тым, што ёсць сёння...

Радуе, што ўсё цяпер праз камп'ютар, што ад рукі там ніхто нічога не піша, засмучае, што няма той колькасці падпіскі і падпісчыкаў. Удзячна кіраўніцтву РУП «Белпошта», што нас, ветэранаў, пенсіянераў, не забываюць, што да прафесійнага свята мы кожны год атрымліваем віншаванні. Ад чаго і самой хочацца адгукнуцца: пажадаць усім былым і сённяшнім калегам моцнага здароўя, міру і дабрабыту, а паштальёнам яшчэ і лёгкага кроку, ясных сонечных дзён, вернасці справе, якой яны служаць.

**Галіна Нічыпаровіч,**
**сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі,**
*Уздзенскі раён.*

Тыя, хто побач

# «У нейкай іншай прафесіі я сябе проста не бачу»

**Ратаваць людзей, дапамагаць ім змагацца з хваробамі — задача медыцынскіх работнікаў.**
**Стаць адным з іх, папоўніць шэрагі прафесіяналаў — справа досыць нялёгкая...**
**Як нялёгкая потым і праца — выслухоўваць кожнага з хворых, прызначаць лекі, разам дабівацца станоўчага выніку... Даваць чалавеку шанц на жыццё без болю і пакут.**
**Даяна Міхайлаўна ЗЕЛЯНКЕВІЧ працуе тэрапеўтам усяго другі год, але і за гэты кароткі час змагла заваяваць аўтарытэт.**

— У нашым родзе медыкаў не было, — кажа маладая ўрач. — Ды і я сама падчас вучобы ў школе пра гэтую прафесію неяк не марыла. Былі перамогі на алімпіядах па фізіцы і матэматыцы, па хіміі і біялогіі. Яны адчынялі дзверы ў любыя ўніверсітэты краіны. Настаўнікі смаргонскай школы № 5, дзе я вучылася, бачылі мяне сваёй каляжанкай... Гэта бацькі нараілі паступаць у медыцынскі. Я паслухала іх і, здаецца, не памылілася.

Як залатая медалістка Даяна без праблем атрымала студэнцкі білет і адразу ж захапілася вучобай. Ёй былі цікавыя лекцыі, семінары, новая тэрміналогія, практычнае знаёмства з хворымі ў паліклініках і палатах бальніц... Ёй заўсёды хацелася даведацца больш.

Пасля вучобы малады спецыяліст прыехала працаваць у Ашмяны, стала тэрапеўтам на ўчастку вельмі паважанай Марыны Іванаўны Лукашэвіч, якая па ўзросце выйшла на заслужаны адпачынак.

Спачатку, як прызнаецца Даяна, адчувала сябе не вельмі ўпэўненай, хоць за плячыма была інтэрнатура... Але ж там — пад кіраўніцтвам куратара, а тут...

На шчасце, папярэдніца Марына Іванаўна Лукашэвіч пакінула сваёй змене ўшчыцы не толькі высокую планку аўтарытэту, але і вельмі вопытную, умелую медсястру, з якой працавала ў пары. Якраз яна, Алёна Пятроўна Гасцевіч, пазнаёміла маладую доктарку з хворымі ўчастка, стала для яе надзейнай памочніцай і сяброўкай.

З усмешкай успамінае Даяна Міхайлаўна сваіх вясковых пацыентаў, іх дамы і хаты, брамкі з грознымі надпісамі «Асцярожна, злы сабака!».

Гэтыя папярэджанні спачатку пужалі маладога ўрача, аднак сабакі, як правіла, былі зусім не злыя і служылі гаспадарам замест... званкоў: як толькі пачыналі брахаць, хтосьці адразу ж крочыў насустрач.

На кантролі ў Даяны Міхайлаўны пацыенты з астмай, гіпертаніяй, стэнакардыяй, з многімі іншымі хваробамі. Для пастаяннага назірання за імі ёсць спецыяльная запісная кніжачка з адрасамі і тэлефонамі. Аднак і «чужым» хворым, «прыпісаным» да іншых урачоў, Даяна Міхайлаўна ніколі не адмаўляе ў прыёме. Неяк сужэнцы Сідаровічы — пенсіянеры, інваліды — не заспеўшы на месцы свайго доктара, звярнуліся па дапамогу ў суседні кабінет. Даяна Міхайлаўна прыняла іх і не адпусціла, пакуль не пераканалася, што хворым палягчэла. «Я ў свае амаль 90 не магу часта наведваць паліклініку, — кажа Мар'ян Адольфавіч Рудэўскі, — дык Даяна Міхайлаўна сама трывожыцца: тэлефануе, наведвае. Ад яе дабрадушнасці, ад прыемнай усмешкі адразу ж становіцца святлей»...

— З часам, — прызнаецца ўрач, — я ўсё больш пераконваюся ў тым, што парада бацькоў была вельмі слушнай: у нейкай іншай прафесіі я сябе проста не бачу.

**Мікалай Балыш,**
*г. Ашмяны.*

Весткі з месцаў

# «ПАДАРУНАК ДЗЕДУ МАРОЗУ» І ГЛЕДАЧАМ

## Нездарма Бялінскі назваў тэатр праўдзівым храмам мастацтва

**З ім нельга не пагадзіцца, бо гэта і насамрэч месца, дзе адбываецца маральнае ператварэнне чалавека, дзе спалучаецца амаль усё: акцёрскае майстэрства, музыка, скульптура, жывапіс...**



Званне народнага прысвоена сёлета тэатру «СМОЛТ», створанаму на базе нашага раённага цэнтра культуры, можна сказаць, нядаўна: у цяжкія часы каранавіруснай пандэміі.

«Многія тады сядзелі па дамах, па кватэрах, — кажа кіраўнік «СМОЛТа» Вольга Сямёнава. — Але ж былі аднадумцы, людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія хацелі дзейнічаць, ствараць прыгожае і цікавае. Яны змаглі згуртавацца, сабрацца разам.

Цяпер у складзе тэатра 21 чалавек. Гэта смаргонцы, людзі тутэйшыя, улюбёныя ў тэатр. Яны самага рознага ўзросту і розных сфер дзейнасці: прафесіянал, дыпламаваны рэжысёр-пастаноўшчык, толькі кіраўнік — Вольга Сямёнава.

У творчай скарбонцы энтузіястаў налічваецца каля 15 спектакляў, літаратурна-драматычныя кампазіцыі, тэатралізаваныя замалёўкі. Поспехам у гледачоў карыстаецца спектакль «Прабачэнне», над якім (сцэнарый, дэкарацыі, касцюмы, святло і музыка) працаваў увесь творчы калектыў і ў якім акцёры не іграюць свае ролі, а сапраўды пражываюць іх.

З аншлагам праходзяць і традыцыйныя навагоднія спектаклі «Марозка», «Падарунак Дзеду Марозу». Да сёлетніх Каляд рыхтуецца арыгінальная пастаноўка па матывах казкі «Шчаўкунчык».

**Ілона Смагур,**
*г. Смаргонь.*

Перажытае-незабытае

# «ЯНА ЗАЎСЁДЫ БЫЛА НАПЕРАДЗЕ,

## а калі наперадзе дзяўчына, ці можна мужчынам паказваць свой страх?»

**Сёлета 14 кастрычніка спаўняецца сто гадоў з дня нараджэння актыўнай удзельніцы вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, старшага сяржанта медыцынскай службы, Героя Савецкага Саюза Зінаіды Самсонавай. Яе слаўнае імя ў адным шэрагу з героямі-патрыёткамі Верай Харужай, Аленай Мазанік, Надзеяй Траян, Марыяй Осіпавай...**



Зінаіда нарадзілася ў шматдзетнай сям'і калгаснага каваля ў вёсцы Бабкова Ягор'еўскага раёна Маскоўскай вобласці. Пасля заканчэння сямігодкі працавала санітаркай у доме інвалідаў, марыла стаць фельчарам, а потым і ўрачом. Але гэтыя мары парушыла вайна.

З першых яе дзён дзяўчына працавала на будаўніцтве абарончых умацаванняў на подступах да Масквы, вучылася ў медыцынскім вучылішчы. У 18 гадоў яе прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Спачатку ваявала на Сталінградскім і Варонежскім франтах, потым дывізію, у якой служыла, перакінулі на Беларускі...

Невысокая, светлавалосая дзяўчына хутка стала ўсеагульнай любіміцай: магла спрытна перавязаць параненага, своечасова падбадзёрыць, суцешыць таго, хто сумаваў па доме. Але найбольш уражвала тое, што ў пэўныя моманты санінструктар брала ў рукі аўтамат... «Яна заўсёды была наперадзе, — пісала пра Зіну яе аднапалчанка Юлія Друніна, якая пасля вайны стала вядомай паэтэсай. — А калі наперадзе дзяўчына, ці можна мужчынам паказваць свой страх? Той, хто не мог падняцца пад ураганным агнём, чуў хрыплаваты дзявочы голас: «Ану, арол, чаго ўрос у зямлю? Паспееш яшчэ ў ёй наляжацца!»

Сваёй франтавой сяброўцы Юлія прысвяціла адзін з самых праніклівых вершаў «Зінка»:

*На переднем,*
*где все герои,*
*Где медали вручает*
*смерть,*
*Все же имя ее простое*
*Стало ярче других*
*гореть.*
*Не до песен*
*в боях пехоте —*
*Нам бы лучше поесть,*
*поспать...*
*Но о Зинке*
*из третьей роты*
*Стали песни в полку*
*слагать.*

Падчас Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі чырвонаармейцы мужна змагаліся за мястэчка Азарычы. У сапраўдны ўмацаваны апорны пункт з кулямётамі і артылерыйскімі гарматамі фашысты ператварылі закінутую ў багністых нетрах Палесся вёску Холма. Падчас жорсткага бою там загінуў камандзір батальёна, і тады, аддаўшы каманду «За мной!», на варожыя ўмацаванні байцоў павяла санінструктар. Вораг быў знішчаны.

У бai 27 студзеня 1944 года загінула і сама Зінаіда. Перавязваўшы раненага, яна спрабавала адцягнуць яго да сваіх. Аднак... Ад першага стрэлу фашысцкага снайпера загінула сама, ад другога — паранены баец.

Пахавана Зінаіда Самсонава ў брацкай магіле ў пасёлку Азарычы. Імя яе носяць музей баявой славы, медыцынскае вучылішча і вуліца на радзіме, а таксама вуліца ў Азарычах.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
9 кастрычніка 2024 г. № 38 (771)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ У НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ — ПРЫКЛАД ДЛЯ ІНШЫХ КРАІН

## Савет Рэспублікі працягвае размову аб важным

**«Шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» — тэзіс, які, напэўна, не зможа аспрэчыць ніхто. Аб тым, каб гэта былі не толькі прыгожыя словы, але і беларуская рэчаіснасць, кожны дзень клапоцяцца і парламентарыі. У наступны панядзелак, 14 кастрычніка, у Беларусі стартуе тыдзень бацькоўскай любові, у гонар якога Савет Рэспублікі сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой другі год запар рэалізоўвае маштабны праект «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава». Першае з трыяды мерапрыемстваў, якое прайшло ўчора ў верхняй палаце парламента, — прамая тэлефонная лінія па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і, — аб'яднала ўсіх членаў Савета Рэспублікі з неабыякавымі беларусамі.**









Фота БелТА.

### Пра выхаванне асобы, аліменты і крытэрый ацэнкі сем'яў

Умацаванне традыцыйных каштоўнасцяў, статусу сям'і нязменна застаюцца прыярытэтным напрамкам заканатворчай дзейнасці. Гэта пацвярджаюць шматлікія праекты, дыялогавыя пляцоўкі, мерапрыемствы (у тым ліку і міжнароднага ўзроўню) па адпаведнай тэме. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** неаднаразова адзначала, што заканадаўцам важна чуць насельніцтва і пры распрацоўцы розных нарматыўна-прававых актаў прымаць да ўвагі меркаванне людзей, улічваць праблемы, з якімі ім прыходзіцца сутыкацца. Такую магчымасць даюць асабістыя прыёмы грамадзян, якія праводзяцца рэгулярна па ўсёй краіне, і прамыя тэлефонныя лініі. Гэтым разам Наталлі Качанавай патэлефанавала Ілона Сяргееўна з Мазыра. Яна прапанавала прадоўжыць тэрмін выплаты аліментаў да 21 года, пакуль дзіця вучыцца ў каледжы або ВНУ. Па яе словах, часцей за ўсё ў гэты перыяд матэрыяльная нагрузка за тое, каб дзіця атрымлівала адукацыю, кладзецца на аднаго з бацькоў. Таксама яна прапанавала знізіць для маці-адзіночак кошт харчавання дзяцей у школах. Акрамя таго, ішла размова аб тым, каб разгледзець магчымасць пры страце карміцеля ўвесці дадатковы механізм падтрымкі сям'і па аплаце вучобы дзіцяці. Спікер паабяцала разгледзець гэтыя пытанні.

Некаторыя пытанні, з якімі звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі, не былі напрамую звязаны з сямейнай палітыкай, але яны непасрэдным чынам уплываюць на выхаванне дзяцей. У прыватнасці, жыхар Калядзічаў, што пад Мінскам, падняў пытанне ўвекавечвання памяці салдат, якія загінулі ў гэтай мясцовасці ў 1941 годзе. Тады людзі пахавалі сваіх герояў на мясцовых могілках, але ў 1942 годзе магіла была разбурана. І з таго часу пра абаронцаў амаль ніхто не ўспамінаў. Але мясцовыя жыхары памятаюць і хочуць аддаць даніну павагі загінулым салдатам — выдатны і вельмі яркі інструмент патрыятычнага выхавання дзяцей і падлеткаў. Наталля Качанава адзначыла, што гэта пытанне ўзята на кантроль.

Закраналіся тэмы і выхавання асобы праз сучасныя сродкі. Жыхар Віцебскай вобласці папрасіў звярнуць увагу на ролікі ў Tik-Tok, у якіх трансліруецца антыпрапаганда шматдзетных сем'яў. Па яго словах, гэта, па-першае, негатыўна ўплывае на маладых людзей, па-другое, стварае памылковы імідж усёй краіны. Таксама мужчына звярнуў увагу на перагібы ў рабоце службаў, якія сочаць за тым, як жывуць дзеці ў сем'ях. Ён расказаў пра выпадкі, калі ў кватэры не было пажарных апавяшчальнікаў, і сям'ю ставілі на ўлік як праблемную, хоць бацькі і клапоцяцца пра дзяцей, забяспечваюць іх і выхоўваюць. Прывёў у прыклад выпадак, калі дзіця з добрай сям'і падчас гульні атрымала невялікую траўму, і сям'ю таксама паставілі на ўлік. Па яго словах, гэта таксама можа адштурхоўваць маладых людзей ад нараджэння дзяцей, бо нават за нецярэчныя невялікія недахопы, якія ёсць ва ўсіх, могуць быць вялікія праблемы. Наталля Качанава пагадзілася, што існуюць выпадкі, калі справа пераходзіць да абсурду. Яна прапанавала разгледзець падобныя сітуацыі на форуме «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» ў Полацку.

Падчас прамой тэлефоннай лініі да Наталлі Качанавай звярталіся з просьбамі пасадзейнічаць у працаўладкаванні, з жыллёвымі пытаннямі, з праблемамі крэдытавання. Ні адзін тэлефонны званок Старшыні Савета Рэспублікі не пакінула без увагі. Некаторых заяўнікаў спікер прыме падчас будучага прыёму грамадзян у Магілёве.

### Сям'я — найважнейшы складнік нашага грамадства

Адначасова з тэлефоннымі званкамі ў кабінеце Наталлі Качанавай яны гучалі і ў кабінетах усіх членаў Савета Рэспублікі. Да **намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Сяргея ХАМЕНКІ** звярнулася жанчына з Лоева. Яе і мужа пасля заканчэння медыцынскай ВНУ размеркавалі ў розныя гарады, што, зразумела, не спрыяе ўмацаванню сямейных адносін.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ТРЭБА РАБІЦЬ УСЁ, КАБ ЖЫЦЬ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

## Што Наталля КАЧАНАВА абмяркоўвала з будучымі педагогамі

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава ў Савеце Рэспублікі сустрэлася з навучэнцамі Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа. Размова, якая праходзіла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі, атрымалася цёплай і шчырай. Наталля Качанава прызналася, што ў яе была мара стаць педагогам. «І я рада сустрэцца з маладымі людзьмі, якія атрымліваюць гэтую прафесію. Шчыра рада за вас, я ўпэўнена, што вы любіце людзей, любіце дзяцей, таму што па-іншаму нельга ісці працаваць у школу. Вы самі вучыліся ў школе і бачылі: калі педагог ставіцца з душой, то ёсць вынік», — адзначыла яна.**

Падчас сустрэчы спікер расказала аб дзейнасці Савета Рэспублікі, паведаміла, як распрацоўваюцца законы, якія этапы праходзяць дакументы перад тым, як іх прымаюць. Паводле слоў спікера, маладзёжная палітыка для тых, хто працуе ў органах дзяржаўнай улады, — аснова. «Вы — наша будучыня. Мы разумеем: з якімі традыцыямі вы прыйдзеце, такой і будзе наша дзяржава. Вельмі важна, каб гэта ўсведамлялі і разумелі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Асобна Старшыня Савета Рэспублікі спынілася на тым, чаму 2024 год — асаблівы. Гэта год, калі ўпершыню ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй правялі адзіны дзень галасавання, абраны дэпутаты ўсіх узроўняў — ад сельскіх Саветаў да Палаты прадстаўнікоў, у красавіку сфарміраваны склад Савета Рэспублікі. Гэты год — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Мы ўспамінаем нашу слаўную гісторыю, тых людзей, якія абаранілі свабоду і незалежнасць нашай краіны. Гэта ж актуальна і сёння. Вы бачыце, колькі гарачых кропак у свеце, таму мы павінны зрабіць усё, каб захаваць мір і спакой на нашай зямлі. З аднаго боку, мы дасягнулі таго, што жывём у такой цудоўнай краіне, дзе ёсць усё для рэалізацыі сваіх магчымасцяў. З іншага боку, працэсы, якія адбываюцца вакол, не могуць нас не насцярожваць», — зазначыла Наталля Качанава. Сёлета адзначаліся важныя падзеі і ў жыцці краіны — 30 гадоў Асноўнаму Закону Рэспублікі Беларусь, 30 гадоў інстытуту прэзідэнцтва.

«2024 год — Год якасці. Зусім нядаўна Прэзідэнт размаўляў са студэнтамі інжынерных ВНУ і агучыў ідэю правядзення пяцігодкі, прысвечанай Году якасці. У 2025-м мы будзем адзначаць 80-годдзе Вялікай Перамогі, праводзіць выбары Прэзідэнта — важную палітычную кампанію. Заканчваецца пяцігодка, таму ўжо сёння пастаўлена задача працаваць над прагнознымі паказчыкамі сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку», — адзначыла Наталля Качанава. На заканчэнне ўступнага слова спікер звярнулася да прысутных: «Для таго, каб мы жылі ў такой мірнай і спакойнай краіне, павінна быць адзінства ў імкненні захаваць гэта. Трэба рабіць усё, каб жыць на сваёй зямлі, у сваёй роднай Беларусі. Вас тут любяць, шануюць. Усё, што робіць Прэзідэнт для нашай краіны, — гэта неймаверная праца, неймаверныя намаганні па захаванні міру і спакою. Калі мы з вамі будзем дапамагаць адно аднаму — у гэтым залог поспеху».

Старшыня Савета Рэспублікі адказала на ўсе пытанні навучэнцаў педагагічнага каледжа. Паразважалі і над тым, што робіць Беларусь унікальнай, як ідуць справы за межамі нашай краіны, якія асноўныя якасці педагогаў.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ У НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ — ПРЫКЛАД ДЛЯ ІНШЫХ КРАІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Парламентарый узяў гэты зварот на кантроль, паколькі, па яго словах, няма ў краіне пытанняў, якія не датычыліся б членаў Савета Рэспублікі. «Сямейныя каштоўнасці, абарона мацярынства і дзяцінства, павага да бацькоў і клопат аб дзецях як аб будучыні нашай краіны — шлях, з якога мы дакладна не звернем. Падтрымка сем'яў у нашай дзяржаве — прыклад для іншых краін. Клопат аб ветэранах, аб сямейным дабрабыце, аб маці і дзецях — усё гэта зыходзіць з таго прынцыпу, які дэкларуе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: дзяржава для чалавека і ў імя чалавека», — адзначыў Сяргей Хаменка. Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі выбудавана стройная нарматыўная прававая сістэма, якая рэгулюе пытанні сям'і.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей АЛЕЙНІК** адзначыў, што беларуская сямейная палітыка выйшла за межы краіны. Ён нагадаў, што менавіта наша краіна вылучыла ініцыятыву на пляцоўцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 2015 годзе аб умацаванні традыцыйнай сям'і. Створана адказная Група сяброў сям'і, у якую ўваходзяць Беларусь і шэраг іншых краін. Заснаваны Міжнародны дзень сям'і, які адзначаецца 15 мая. «Сямейная палітыка — адзін з асноўных напрамкаў сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. Дзяржава аказвае сур'ёзную падтрымку маладым сем'ям, і гэта падтрымка шматгранная. Сёння ёсць дакладнае разуменне таго, што сям'я — гэта сапраўды найважнейшы складнік нашага грамадства. У сям'і закладваюцца маральныя, духоўныя і патрыятычныя асновы, сям'я фарміруе аснову асобы чалавека. Сям'я адлюстроўвае адзінства нашага грамадства. Нядаўна мы адзначылі Дзень народнага адзінства. І гэта свята ў многім грунтуецца на тых сямейных каштоўнасцях, якія не праходзяць, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне», — адзначыў Сяргей Алейнік.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ** расказаў, што яму паступалі званкі не толькі па тэме сямейнай палітыкі, але і па іншых пытаннях. Усе без выключэння былі разгледжаны і ўзяты на кантроль. Былі звароты, непасрэдна звязаныя з дзейнасцю камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. «Напрыклад, жыхарка Наваполацка звярнулася з пытаннем пераводу бізнесу са статусу індывідуальнага прадпрымальніка ў статус юрыдычнай асобы. Для гэтага створаны камфортныя ўмовы, але ўсё роўна на практыцы ўзнікаюць тэхнічныя моманты. Гэтымі пытаннямі мы таксама будзем займацца», — прывёў прыклад Уладзіслаў Татарыновіч. Ён адзначыў, што гэтая прамая лінія вельмі важная для ўсіх членаў Савета Рэспублікі. «Пачынаючы ад пытанняў заканадаўчай дзейнасці (не так даўно былі ўнесены адпаведныя змены ў цэлы комплекс заканадаўчых актаў, уключаючы Кодэкс аб шлюбе і сям'і) і заканчваючы правядзеннем розных конкурсаў і мерапрыемстваў. Для нас пытанні, якія былі вынесены на прамую тэлефонную лінію, важныя з пункту гледжання таго, што мы фактычна пачынаем работу над фарміраваннем праекта бюджэту фонду сацыяльнай абароны на наступны год. Таму з улікам комплексу сістэмных форм сацыяльнай падтрымкі, якія датычацца шлюбу і сям'і, я магу з упэўненасцю сказаць, што прыярытэт сацыяльнай накіраванасці на наступны год захоўваецца і дасць магчымасць выконваць усе гарантыі, замацаваныя ў заканадаўстве», — растлумачыў ён.


Аляксандр ГАРОШКІН.


Ірына ПЕТРУСЕВІЧ.


Ала СМАЛЯК.


Віктар АНАНІЧ.


Андрэй ЖАМОЙДА.

«Праводзячы сёння прамую тэлефонную лінію, я адчуў, што вельмі правільна вызначаны мэтавы падыход да такога мерапрыемства. Прамыя тэлефонныя лініі па вузкіх тэмах, якія трывожаць людзей, вельмі цікавыя. Мне сёння патэлефанавалі 12 чалавек. Пытанні ўсе важныя для нас, заканадаўцаў. Асноўная маса пытанняў датычылася выплаты аліментаў. Першае — ухіленне. Другое — той мінімум, які атрымліваюць дзеці ад бацькі, які не працуе афіцыйна і плаціць 200 рублёў, або ад самазанятых грамадзян яшчэ менш атрымліваюць дзеткі. Ёсць пытанні, якія датычацца падзелу маёмасці, яны патрабуюць самага сур'ёзнага разгляду. Узнімаліся тэмы індэксацыі сум аліментаў, дапрацоўкі прававых асноў дагавора аб шлюбе. Сёння мы вялі размову аб тым, што можна паспрабаваць аднавіць сем'і. Бо самае галоўнае, каб сям'я была разам», — падзяліўся падрабязнасцямі прамой тэлефоннай лініі старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы.

## На сувязі — рэгіёны

З людзьмі актыўна камунікавалі і члены Савета Рэспублікі, якія працуюць у рэгіёнах. Да **члена Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктара інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Ірыны ПЕТРУСЕВІЧ** звярнулася жыхарка Магілёва. Жанчына з мужам выхоўваюць траіх дзяцей і, як многія бацькі, занепакоены тым, што ў інтэрнэце дзеці могуць убачыць прапаганду нетрадыцыйных каштоўнасцяў. Яна прапанавала ў Беларусі на заканадаўчым узроўні разгледзець меры, якія змогуць узмацніць акцэнт на традыцыйных сямейных каштоўнасцях.

Тыя, хто тэлефанаваў **члену Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Але СМАЛЯК,** цікавіліся, што робіцца ў краіне для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі, якая доля ў структуры выдаткаў прыпадае на сацыяльную сферу.

Таксама прагучала пытанне аб выплаце дапамог у сувязі з нараджэннем дзіцяці і ці чакаюцца ў гэтай тэме карэкціроўкі. Па кожным звароце Ала Смаляк дала тлумачэнні.

**Андрэю ЖАМОЙДУ, члену Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, кіраўніку прадпрыемства «Конус» НПЦ НАН па механізацыі сельскай гаспадаркі,** паступілі званкі з розных рэгіёнаў Беларусі. Жыхар Ліды прапанаваў звярнуць увагу на павышэнне інфармавання грамадзян аб сумах сацыяльных расходаў дзяржавы, у тым ліку якія выдзяляюцца на дзяцей, каб усе грамадзяне мелі дакладнае ўяўленне, як працуе сістэма сацыяльнай падтрымкі ў нашай сацыяльна арыентаванай дзяржаве.

«Нашы грамадзяне актыўна карыстаюцца магчымасцю паразмаўляць па актуальных пытаннях з членамі Савета Рэспублікі. Прыемна, што падчас прамых ліній паступаюць не толькі пытанні, просьбы і прапановы, але і падзякі», — адзначыў **Віктар АНАНІЧ, член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення Беларусбанка.**

У прыватнасці, жыхарка Краснапольля датэлефанавалася парламентарыю, каб падзякаваць за рэалізаваны па ініцыятыве Віктара Ананіча і падтрымцы Беларусбанка праект па ўстаноўцы памятнага мемарыяла аб вёсках Краснапольля, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы. Грамадзянка з Быхава папрасіла ў Віктара Ананіча садзейнічання ва ўсталяванні агароджы і навядзенні парадку на закінутых участках. Жанчына расказала, што пражывае ў прыватным доме, у якога сумежная сцяна з іншым домам. Тым не менш па ўсіх дакументах гэта асобныя дамы. Толькі другі даўно без гаспадароў (папярэднія памерлі, а спадкаемцаў няма). У выніку склалася сітуацыя, калі ўчастак другога дома аказаўся зусім закінутым, зарос травой і дрэвамі, плот разбураны, і на тэрыторыю бесперашкодна можа трапіць хто заўгодна. Як адзначыў Віктар Ананіч, для вырашэння гэтага пытання плануецца прыцягненне мясцовых органаў улады.

Да **члена Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандра ГАРОШКІНА** звярнулася жыхарка Магілёва па пытанні добраўпарадкавання дзіцячай гульнявой пляцоўкі ў двары жылога дома. У сувязі з павелічэннем нараджальнасці гэтыя клопаты становяцца ўсё больш актуальныя. Падчас гутаркі сенатар прапанаваў адзін з варыянтаў вырашэння пытання — рэалізацыю грамадзянскай ініцыятывы з удзелам насельніцтва. Аляксандр Гарошкін даў даручэнні дэпутацкаму корпусу горада. Пытанне ўзята на кантроль.

* * *

Пытанні, з якімі звярталіся да членаў Савета Рэспублікі, былі самыя розныя: ад добраўпарадкавання дзіцячых пляцовак у асобным горадзе да мер падтрымкі сем'яў у маштабе ўсёй краіны. Ні адно пытанне не засталося без увагі,і, як паказвае практыка, па кожным звароце будзе дадзены канкрэтны адказ, а там, дзе трэба, і рэальная дапамога.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У рамках святочнай трыяды мерапрыемстваў запланавана таксама сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з сем'ямі з усіх рэгіёнаў краіны ў Полацку. У гэтым жа горадзе пройдзе форум «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», дзе будуць абмеркаваны пытанні ўмацавання сацыяльнага статусу сям'і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў у беларускім грамадстве, духоўна-маральнага выхавання моладзі, дэмаграфічнай бяспекі краіны і іншыя праблемы. Горад абраны невыпадкова: калыска беларускай дзяржаўнасці — такі ж сімвал нашай краіны, як і моцная, шчаслівая сям'я. Пройдуць запланаваныя мерапрыемствы ў Сафійскім саборы, святым для кожнага беларуса месцы, якое само натхняе на размовы аб важным.

# «Зваротная сувязь фарміруе стратэгію развіцця мясцовасці»

## Алена Пасюта правяла сустрэчу з дэпутацкім актывам у Берастравіцкім раёне

**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў наведала Эйсмантаўскі сельскі Савет, даведалася аб тым, як развіваецца аграгарадок і на якія праекты накіраваны намаганні месцічаў на найбліжэйшы час. У сваю чаргу, Алена Пасюта акцэнтавала ўвагу на такі важны рэсурс, як грамадзянскія ініцыятывы, дзякуючы якім насельніцтва аб'ядноўваецца для рэалізацыі тых ці іншых ідэй.**



### Рух наперад

На пачатку сустрэчы адзначалася, што Берастравіцкі раён не стаіць на месцы, многае радуе вока: як дагледжаныя палеткі, так і выгляд населеных пунктаў. Але гэта не значыць, што можна супакоіцца. На парадку дня нямала праблем, якія трэба паслядоўна вырашаць.

— Наша галоўная задача накіравана на работу з насельніцтвам, — зазначыла Алена Пасюта. — Тое, як працуе зваротная сувязь, дазваляе распрацоўваць стратэгію развіцця ў сваёй мясцовасці і, такім чынам, крок за крокам рухацца наперад.

Па словах старшыні сельвыканкама Ганны Болдак, у аграгарадку Вялікія Эйсманты ствараюцца ўсе ўмовы для камфортнага пражывання ў сельскай мясцовасці. Выконваюцца стандарты па сацыяльным і медыцынскім абслугоўванні, адукацыі, гандлёвым забеспячэнні. Працуе Дом культуры, школа мастацтваў, ёсць конна-спартыўная школа, дзе аказваюцца паслугі іпатэрапіі. Развіццю тэрыторыі спрыяе і адносная блізкасць да абласнога і раённага цэнтраў. Адной з адметных асаблівасцяў аграгарадка з'яўляецца брэндавае свята «Эйсмантаўскі фэст», якое дэманструе талерантныя адносіны паміж праваслаўнай і каталіцкай канфесіямі.

Вялікая работа па добраўпарадкаванні была праведзена падчас падрыхтоўкі да раённых «Дажынак».

Дарэчы, сёлета ў Берастравіцкім раёне прынята новая канцэпцыя, звязаная са святам хлебаробаў. Цяпер «Дажынкі» будзе прымаць не раённы цэнтр, а кожны аграгарадок па чарзе. Месцы правядзення свята вызначаны на найбліжэйшыя тры гады. Першым якраз і сталі Вялікія Эйсманты. Тут да свята ў гарадскім парку з'явілася гандлёвая зона і музычны фантан з каляровай падсветкай. Новыя лакацыі сталі працягам добраўпарадкавання паркавай зоны, плошча якой складае 2,5 гектара.

Значныя сродкі на навядзенне парадку ўкладзены мясцовым сельгаспрадпрыемствам «Варанецкі», якое ўзначальвае Юрый Ярэміч. Ён паведаміў, што на падрыхтоўку да «Дажынак» патрачана 400 тысяч рублёў. Ёсць планы і на далейшае ўдасканальванне паркавай інфраструктуры. Мяркуецца, што работы будуць весціся на працягу двух гадоў. За гэты час трэба давесці да ладу дзіцячую пляцоўку, дадаць сюды новыя элементы, у тым ліку батут. Для падлеткаў на спартыўнай пляцоўцы плануецца ўстанавіць адпаведныя трэнажоры. Не будзе пакінуты без увагі і так званы «Мосцік закаханых», каля якога ёсць намер уладкаваць фотазону з карэтай і конікам. Але самым маштабным праектам парку стане міні-басейн і цяплічка. «Сёння парк працуе на людзей, але яго патэнцыял не да канца асвоены. Тут яшчэ можна ўвасобіць нямала карысных ідэй», — лічыць Юрый Ярэміч. Але разам з тым зазначае, што ўсе задумкі будуць ажыццяўляцца ў адпаведнасці з фінансавымі магчымасцямі.

### Заканадаўства ў дапамогу

Новыя ідэі вельмі важна рэалізаваць, лічыць старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта. Калі ёсць жаданне, сродкі можна знайсці, у тым ліку ў абласным і рэспубліканскім бюджэтах. У сувязі са змяненнем заканадаўства «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» з'явілася магчымасць рэалізаваць свае праекты ў рамках конкурсу






грамадзянскіх ініцыятыў. Берастравіцкі раён адзін з нямногіх, дзе пакуль не скарысталіся такой магчымасцю. Між тым, алгарытм гэтай работы ўжо адпрацаваны і мае добры вынік.

— У Гродзенскай вобласці да канца года будзе рэалізавана 15 ініцыятыў. Некалькі праектаў можа прапанаваць Эйсмантаўскі сельскі Савет пры падтрымцы мясцовай гаспадаркі. Напрыклад, тая ж спартыўная пляцоўка ці рэканструкцыя мосціка закаханых. Але, згодна з умовамі конкурсу, патрэбны і актыўны ўдзел ініцыятыўных грамадзян. Думаю, што насельніцтва гатова аб'ядднацца, каб ажыццявіць дадзеныя праекты. Бо наша агульная задача — гэта аб'яднанне людзей дзеля агульнай справы. А грамадзянская ініцыятыва — той самы механізм, які выконвае сацыяльную функцыю, — упэўнена Алена Пасюта.

Найлепшым прыкладам такой супольнасці з'яўляецца добраўпарадкаванне месцаў агульнага карыстання, у прыватнасці цэнтральнага парку. Пакуль работа тут вядзецца толькі сіламі гаспадаркі.

Па словах старшыні Берастравіцкага раённага Савета дэпутатаў Паўла Панкевіча, інфраструктура парку напаўняецца паэтапна. Напачатку была ўсталявана зона для гледачоў, якая стала месцам правядзення масавых мерапрыемстваў.

### Талака — гэта па-нашаму

Менавіта ўдзел саміх жыхароў з'яўляецца самай галоўнай умовай праекта. У гэтым сутнасць самога конкурсу, які аб'ядноўвае людзей дзеля значных для іх жыцця мэт.

— Для таго, каб людзі цанілі свой родны куток, яны павінны прыняць удзел у яго добраўпарадкаванні. Вопыт суботнікаў тут вельмі дарэчы. Наогул, гэта ў традыцыях і менталітэце беларусаў — працаваць талакой. Мы не жылі ніколі асобна. А грамадзянскія ініцыятывы дапамагаюць аб'яднаць вялікую колькасць людзей, уцягваюць іх у сумесную грамадска карысную дзейнасць, — падкрэсліла ў ходзе дыялогу Алена Пасюта.



> Па словах старшыні сельвыканкама Ганны Болдак, у аграгарадку Вялікія Эйсманты ствараюцца ўсе ўмовы для камфортнага пражывання ў сельскай мясцовасці. Выконваюцца стандарты па сацыяльным і медыцынскім абслугоўванні, адукацыі, гандлёвым забеспячэнні. Працуе Дом культуры, школа мастацтваў, ёсць конна-спартыўная школа, дзе аказваюцца паслугі іпатэрапіі. Развіццю тэрыторыі спрыяе і адносная блізкасць да абласнога і раённага цэнтраў.

Паступова з'явіліся іншыя лакацыі, і гэтыя работы будуць працягвацца, падкрэсліў падчас экскурсіі па парку старшыня райсавета.

Ён зазначыў, што месца адпачынку прыйшлося даспадобы ўсім пакаленням мясцовых жыхароў. Яны таксама ўносяць свае прапановы наконт элементаў інфраструктуры. Гэтыя ідэі падтрымліваюцца, асабліва тыя, што датычаць маладзёжнага асяроддзя. Напрыклад, быў добраўпарадкаваны вадаём, адхоны якога абклалі камянямі і зладзілі дэкаратыўныя дарожкі. «Магчыма, справа пойдзе хутчэй, калі мы зможам атрымаць фінансавую падтрымку праз конкурс грамадзянскіх ініцыятыў. Гэта будзе для нас добрай дапамогай, тым больш што ўсе складнікі ў нас ёсць: сельскі Савет, спонсар у асобе мясцовай гаспадаркі і ініцыятыўныя жыхары. Таму думаю, што ў наступным годзе ад нас таксама паступяць заяўкі на ўдзел у абласным конкурсе праектаў», — запэўніў старшыня райсавета.

На яе думку, вельмі важна, каб такія ініцыятывы зыходзілі ад саміх жыхароў і былі накіраваны на кансалідацыю грамадства. У гэтым плане неабходны жывыя кантакты органаў улады, дэпутатаў з насельніцтвам, бо толькі такім чынам можна зразумець, якія праблемы яго хвалююць, і знайсці шляхі вырашэння, дабіцца рэальнага паляпшэння жыцця людзей.

Вялікія Эйсманты — адзін з аграгарадкоў, дзе расце колькасць насельніцтва. А гэта той індыкатар, які разам з экалогіяй ацэньвае якасць жыцця, зазначыла Алена Пасюта. Па яе словах, у Берастравіцкім раёне створана нераўнадушная каманда, якая зацікаўлена ў яго развіцці.

Напрыклад, у сельгаспрадпрыемстве «Варанецкі», дзе працуе 430 чалавек, вялікую ўвагу надаюць замацаванню кадраў. Маладыя спецыялісты атрымліваюць даплаты, для пражывання ёсць трохпакаёвая кватэра, закуплена новая мэбля. Сярэдняя зарплата па гаспадарцы склала за першыя паўгода 2300 рублёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

# ХОБІ — СТВАРАЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ

## Муж і жонка з Белавежскага добраўпарадкавалі кавалак вуліцы насупраць уласнага дома

**На нядаўнім семінары Палаты прадстаўнікоў, які праходзіў на базе Баранавічаў, Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў, падобныя добрыя справы называлі грамадзянскімі ініцыятывамі. Так і ёсць, асабліва калі пачынанні былі належным чынам афармлены і зафіксаваны. Але ж многія і многія нашы людзі ажыццяўляюць уласныя задумкі, у тым ліку на агульную карысць, не клапоцячыся пра іх вызначэнне. Вось як Валянціна Белая з Белавежскага. Вясковая жанчына не называе ўладкаваны ёю маленькі аазіс грамадзянскай ініцыятывай і не лічыць свой удзел у добраўпарадкаванні вуліцы Лясной нечым асаблівым. Проста яна так жыве, каб вакол усё расло, цвіло, зеленела. Колькі сябе памятае, стварае прыгажосць.**



Белавежскі — пасёлак новы, вырас адначасова з будаўніцтвам жывёлагадоўчага комплексу. Тут у асноўным усе прыезджыя. Напрыклад, Валянціна Яўгенаўна родам з Бярозаўскага раёна, яе муж Аляксандр Яўгенавіч вырас на Гродзеншчыне. Пазнаёміліся яны ў Брэсце, калі Валя вучылася на кухара, а Аляксандр ужо працаваў. Як яна згадвае, нават на прыватнай кватэры маладой сям'і было матэрыяльна складана. Вось і сталі шукаць месца працы, дзе б забяспечвалі жыллём. Такім месцам аказалася вялікае сельгаспрадпрыемства «Белавежскі» ў Камянецкім раёне. Ім прапанавалі работу на новым мясакамбінаце і адразу далі два пакоі ў інтэрнаце, які ўсе называлі баракам за выцягнутую форму будынка. Праз два гады яны ўжо атрымалі асобную кватэру, а ў 2007 годзе пераехалі ў новы дом, які пабудавала гаспадарка.

Вось тут стала набываць рэальныя абрысы яе даўняя мара — жыць у прыгожым доме, з уладкаваным на свой густ падворкам. Гэтай справе муж і жонка прысвяцілі не адзін год. І цяпер не толькі іх падворак, але і ўвесь участак уяўляе сабой карцінку. Нават тая палова, якая занята агародам з невялікай цяпліцай, добраўпарадкавана так, што хоць на вокладку ў глянцавы часопіс. Усе градкі, межы, участкі з травой выглядаюць на здзіў гарманічна! Побач пастаўлены лавачкі, адпачыць можна тут жа, напрыклад, напрацаваўшыся ў агародзе. Тэрыторыя распланавана рацыянальна, знайшлося месца для зоны барбекю і, вядома ж, для клумбаў з кветкамі.

Цяпер Валянціна Белая працуе на камбікормавым заводзе ААТ «Белавежскі» зменным майстрам. Работа патрабуе ўвагі, засяроджанасці. Гаспадыня расказвае: «Цэлую змену знаходжуся ў памяшканні два на чатыры метры з мноствам прыбораў і да канца змены ўжо скурай адчуваю патрэбу дыхнуць свежым паветрам каля сваіх любімых зялёных насаджэнняў. Папрацаваць пасля работы дзве-тры гадзіны на зямлі для мяне — своеасаблівы рэлакс, адпачынак душы. Адразу прыходзіць спакойны, добры настрой, палягшаецца самаадчуванне. Яны, гэтыя расліны, нібы падсілкоўваюць мяне энергіяй. А яшчэ люблю эксперыменты. У мяне ніколі не бывае два гады запар адной і той жа кампазіцыі на падворку. Увесь час нешта мяняецца, удасканальваецца. Часам шкадую, што за плячыма няма якіх-небудзь дызайнерскіх курсаў. Важна, што муж дапамагае ва ўсім. Калі я агучу ідэю перанесці на іншае месца сваю архітэктурную форму з камянёў, то ён бярэ і нясе. У асноўным жа ўсё робім разам», — падсумавала Валянціна Яўгенаўна.



Але, уладкаваўшы на свой густ падворак, на тым не спынілася. Цераз дарогу насупраць дома раней была фактычна вялікая пустка, дзе раслі высокая трава, хмызняк, пустазелле. Вядома ж, не ў характары Валянціны дапускаць, каб зямля такім чынам «гуляла». І яны з мужам паступова, з кожным годам сталі ператвараць нічыйны лапік у астравок прыгажосці. На гэтым участку з'явіліся дэкаратыўныя кусты, невялікія дрэўцы, кветкі. Нават малыя архітэктурныя формы знайшлі сабе месца і прымяненне. З вясны да восені тут красуе сад бесперапыннага цвіцення. Ужо адышлі кветкі летнія, але прыгожа квітнеюць жоўтыя хрызантэмы. Апошнія не проста растуць на градзе сярод травы, а, як выглядае, добра сябе пачуваюць на адмысловай круглай клумбе, прамульчыраваныя рэшткамі драўніннай кары. Побач прымасціліся два бярозавыя пянькі па суседстве з высокай туйкай.

> Даўняя мара — жыць у прыгожым доме, з уладкаваным на свой густ падворкам. Гэтай справе муж і жонка прысвяцілі не адзін год. І цяпер не толькі іх падворак, але і ўвесь участак уяўляе сабой карцінку. Нават тая палова, якая занята агародам з невялікай цяпліцай, добраўпарадкавана так, што хоць на выкладку ў глянцавы часопіс. Усе градкі, межы, участкі з травой выглядаюць на здзіў гарманічна. Побач пастаўлены лавачкі, адпачыць можна тут жа, напрыклад, напрацаваўшыся ў агародзе. Тэрыторыя распланавана рацыянальна, знайшлося месца для зоны барбекю і, вядома ж, для клумбаў з кветкамі.

— Прыехалі б вы сюды позняй вясной, — гаворыць **старшыня Белавежскага сельскага Савета Ганна ЧАПЛЮК**, — ад саду Валянціны Яўгенаўны вачэй не адвесці! Ды і цяпер, калі наўкола ўсё засыхае і вяне, перад іх домам усё роўна прыгожа. Іх з Аляксандрам Яўгенавічам падворак не раз быў адзначаны па выніках сельсавецкага і раённага конкурсаў. Да іх у любы час хоць дэлегацыі прыводзь: заўсёды чысціня, прыгажосць, ідэальны парадак. І галоўнае, што ўвесь участак такі. У некаторых жыхароў таксама акуратна дагледжаны і ўладкаваны пярэднія зоны падворкаў, а ззаду, на так званай гаспадарчай частцы, выгляд не вельмі... Тут па ўсім перыметры аднолькава: у поўным парадку. Таму і ставім у прыклад, і заахвочваем пры выпадку.

**Старшыня Камянецкага раённага Савета Аксана ВЫСАГРОЦКАЯ** сказала, што такая маленькая ініцыятыва, якую ажыццявілі сужэнцы Белыя, робіць выгляд нашых населеных пунктаў больш яркім, прыгожым, разнастайным. Важна, што муж і жонка не абмежаваліся добраўпарадкаваннем уласнага падворка, а зрабілі прыгожым невялікі ўчастак вуліцы насупраць дома. Хацелася б, каб такіх ініцыятыўных людзей было больш, каб іх актыўная жыццёвая пазіцыя станавілася прыкладам для суседзяў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 11.703. Нумар падпісаны ў 19.30 8 кастрычніка 2024 года.**

# «Я НАТХНЯЛАСЯ ТВОРЧАСЦЮ БЕЛАРУСКІХ БАБУЛЬ...»

## Які культурны код зашыфраваны ў «Абрадvei»?

**Калі для вас паняцце «дызайн адзення» асацыіруецца з чымсьці мімалётным, зменлівым і павярхоўным у праціву мастацтву, вечнаму і непадуладнаму часу, вы маеце рацыю. І адначасова не маеце. Многія дзесяцігоддзі мода і мастацтва крочаць побач. І калі Street style ў поўнай меры дэманструе легкадумны нораў, змяняючыся з кожным новым сезонам, то «высокая мода» — гэта спроба мастака стварыць свой шэдэўр, на які, у ідэале, і праз стагоддзі людзі будуць глядзець з захапленнем, як на «Мону Лізу» або «Тайную вячэру».**

Такія мадэлі менавіта для калекцыі (і іх сапраўды калекцыянірююць). Яны не прызначаны саграваць у халады або карэкціраваць недахопы постаці (хоць могуць і гэта). Яны — чыстае мастацтва і разлічаны ў першую чаргу на тых, «хто разумее». Хаця калі гэта шэдэўр, ён кране сэрца любога, самага далёкага ад арт-індустрыі. Дызайнеры зашыфроўваюць у формах і дэталях аздаблення пасланні, якія прапануецца разгадаць, робяць адсылкі да іншых відаў мастацтва, шукаюць натхненне ў жывапісе і графіцы, музыцы і архітэктуры. Або, як у выпадку з калекцыяй «Абрадvея» Святланы Івашынай, у старажытных абрадах і беларускім фальклоры.

### СПОСАБ РАСКАЗАЦЬ ГІСТОРЫЮ

Калекцыя «Абрадvея» перамагла на апошнім «Млыне моды», стала прызёрам конкурсу «Пушкінскі баль» у Пецярбургу, не засталася незаўважанай шэрагам прэстыжных міжнародных дызайнерскіх форумаў. Але зараз — не пра гэта. А пра тое, што сучаснаму чалавеку ўласціва спрошчанае ўспрыманне нацыянальнай спадчыны. Страва — дранікі, свята — Купалле (варыянт — Дажынкі), песня — «Цячэ вада ў ярок» ці «Купалінка», касцюм — белая вышытая кашуля (можа, яшчэ нехта ўспомніць панёву, а тыя, хто «крыху ў тэме» — намітку)... Але калі вам выпадкова даводзілася чуць не толькі сучасныя стылізацыі з ярка асветленай сцэны, а тое, як спяваюць старадаўнія песні бабулі ў далёкіх ад хуткасных аўтастрад маленькіх вёсачках, вы, напэўна, адчулі: гэта ўвогуле іншае. І рытмы іншыя, і рыфмы, і тэмбр. У гэтых песнях чуецца нешта магічнае, містычнае, старажытнае... Усярэдненага «народнага беларускага касцюма» ўвогуле не існуе, у кожным рэгіёне ён быў свой, і кожная яго дэталь мела ў тым ліку сімвалічнае значэнне. Ну, а абрады — гэта ўвогуле цэлы свет, дзе кожнае дзеянне мае сваё месца і значэнне. Ці можна аб'яднаць усе гэтыя сэнсы з апошнімі моднымі тэндэнцыямі, зірнуць на старажытныя абрады праз прызму сучаснасці? Падаецца, у Святланы Івашынай гэта атрымалася. І таму вынік яе працы — як бы гэта сказаць? — спыняе. Ідзеш сабе ў прыгожай экспазіцыйнай прасторы міма стэндаў, дзе прадстаўлены стыльныя рэчы. Нешта падабаецца, нешта не вельмі, але ўвогуле ўсё ўжо прымільгалася, чалавек жа хутка да ўсяго прывыкае. І раптам... спыняешся. І глядзіш. І хочацца спытаць: «Пра што гэта? Што вы хацелі гэтым сказаць?» Я так і зрабіла — спытала.



— Калекцыя «Абрадvея» навеяна нашымі беларускімі абрадамі і святамі, — звыкла пачынае свой аповед Святлана. Кажа, ена пытаюцца аб гэтай калекцыі часта. — Першы, мой самы любімы, вобраз — Русалле. Што мы ведаем аб русалках? Ну, «русалка на ветвях сидит». На выставе ў Маскве адна жанчына сказала мне: «Нарэшце я зразумела, хто ж гэта — русалка».

Калі вы былі ў школе дапытлівым вучнем, хутчэй за ўсё, задаваліся пытаннем, чаму дзяўчына з рыбіным хвастом «на ветвях сидит». Як яна ўвогуле змагла залезці на дрэва, ды і навошта? Магчыма, калі вы падраслі, то даведаліся, што старажытнаславянская русалка — не дзева-рыба, а дзева-птушка (таму і сядзіць на галіне).



— На самай справе фальклорная русалка — гэта не Арыэль з дыснэеўскага мультфільма і нават не дзева-птушка. Калі капняце глыбей, у беларускім фальклоры гэта душы памерлых незамужніх дзяўчын. Бліжэй да Тройцы, на Русалле, надыходзіць іх тыдзень. Басаногія прыгажуні (так, ногі ў іх ёсць) у доўгіх сукенках бегаюць па каласах, качаюцца на галінах, гойдаюцца на іх... мячаць і топчуць палі і завабліваюць хлопцаў.

Нельга ў гэты дзень, асабліва пад вечар, слухаць незнаёмыя жаночыя галасы і адгукацца на іх, нельга апускаць рукі ў ваду, асабліва мужчынам — замарочаць, уцягнуць, і ніхто з жывых ужо не знойдзе... Русалле — прыгожае старадаўняе свята. Абрад «Праводы русалкі» спрадвеку праводзіўся ў наступную нядзелю пасля Тройцы. Ён быў закліканы абараніць і палі, і людзей ад рознай нечысці, распавядае Святлана. Касцюм, прысвечаны гэтаму абраду, упрыгожаны вышыўкай гладдзю: дрэва і русалкі з распушчанымі валасамі, у доўгіх белых сукенках. І якраз на галінах.



— Пра Купалле расказваць не буду: аб гэтым абрадзе ведаюць усе. Яму я прысвяціла восем гэтую мадэль: бачыце, тут цэнтральны элемент дэкору — папараць-кветка. Наступная мадэль прысвечана менш вядомаму абраду «Ваджэнне стралы» — ён занесены ў Спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Нашы продкі жылі ў культурнай прасторы, дзе хрысціянства арганічна спалучалася з элементамі язычніцкага светаўспрымання. Абрад «Ваджэнне стралы» праводзіўся восенню. Самым каштоўным у старажытнасці людзі лічылі сваю хату, сям'ю, хатнюю жывёлу, і сабраны ўраджай, і з дапамогай гэтага абраду жанчыны прасілі бога Перуна, каб маланка абмінула іх дом, усё самае роднае і каштоўнае, што ў гэтым доме ёсць. Ішлі ў палі, закопвалі розныя металічныя прадметы (падковы, манеткі), якія сімвалізавалі стралу-маланку, спявалі абрадавыя песні — «Ой, пушчу стралу, ды па ўсім сялу». Гэты тэкст я зашыфравала ў дэкоры блэйзера. Ёсць яшчэ спадніца: калі прыглядзецца да дэкаратыўных радкоў, можна прачытаць назвы вёсак Веткаўскага раёна, дзе абрад захаваўся да нашых дзён. Бачыце: Стаўбун, Нехлюбка, Пералёўка...

Тэма наступнай мадэлі — «Гуканне вясны», але Святлана хоча расказаць пра малавядомы, амаль забыты «Багач»:

— Гэта старадаўні аналаг пазнейшых Дажынак, свята прысвячалася багіні ўрадлівасці, было святам ураджаю. Таму гарнітур дапоўнены хусткай з вышытымі каласамі і яблыкамі.

Колеравая гама «Абрадvеі» — яркія, радасныя сонечна-залатыя тоны і глыбокі, таямнічы пурпурны. Але ёсць выключэнне — мадэль, прысвечаная Калядам: яна смарагдавая, а, пераліваючыся на святле, адлівае ў сінявату колер марской хвалі.

***— Чаму «Каляды» зялёныя?***

— Гэта з разраду «Я мастак, я так бачу», — усміхаецца Святлана. — Святы нашы продкі змяшчалі ў часавы прамежак з вясны да восені, а Каляды — адзін з нямногіх зімовых абрадаў. І, калі я думала аб гэтай мадэлі, мне чамусьці захацелася ўтульных тонаў.

На зялёным фоне — жоўта-зялёная «калядная зорка», вышытая іскрыстай ніткай, выглядае ярка і стыльна. «Калядны гарнітур» вылучаецца з агульнай канцэпцыі, ён як быццам іншы. Як і сам абрад. Дапоўнены ён чароўнай шапачкай з жамчужнымі рожкамі. Каза — найстаражытнейшы калядны сімвал урадлівасці і дабрабыту сям'і...

— Шчыра кажучы, прыходжу ў захапленне, калі людзі слухаюць! — прызнаецца Святлана.

***— А людзі слухаюць?***

— Дзіўна, але так. Калі ў Піцеры мая калекцыя выйграла конкурс «Пушкінскі баль», мне падарылі сертыфікат на ўдзел у CPM (Collection Premiere Moscow, самая маштабная міжнародная выстава індустрыі моды ў Расіі. — **Аўт.**). І калі ўсе гэтыя гламурныя дзівы падыходзілі і казалі: «Як класна, раскажыце!» — гэта скарала. Там было шмат людзей з розных краін, нехта слухаў пра беларускія абрады праз перакладчыка. Мне было вельмі прыемна расказваць пра нашу краіну, нашу культурную спадчыну. І, ведаеце, такіх, хто хутка стамляўся і сыходзіў, амаль не было. Людзі ўнікалі.

### КОЛЕРЫ ЛЁСУ

***— Святлана, а як наогул нарадзілася ідэя такой калекцыі?***

— Я вучылася ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Лёс закінуў туды выпадкова. Не паступіла на рэжысуру, і мне падказалі: ідзі ў пед, там ёсць спецыяльнасць «Фальклор і харэаграфія» (справа ў тым, што я захапляюся яшчэ і харэаграфіяй). Так я паступіла на фалькларыста. Там былі цудоўныя педагогі. Усе пяць гадоў на элітнай, літаратурнай беларускай мове яны расказвалі нам пра ўсе абрады. Гэта былі непаўторныя пяць гадоў, з выдатнай вучэбнай праграмай, з высокім узроўнем выкладання. І якімі б мы ні былі «дзвіжовымі» і сучаснымі, мы заўсёды з задавальненнем ішлі «на фольк». Таму што там мы спявалі цудоўныя старадаўнія песні, з крутымі інструментамі, з усёй гэтай этнікай. Мы слухалі лекцыі, ад якіх проста «мурашкі па скуры». Мы ўсё гэта ўбіралі ў сябе. Такім чынам я ўлюбілася ў народны фальклор... Потым пайшла ў іншую сферу, у творчасць, стала сама выкладаць у Мінскім дзяржаўным каледжы лёгкай прамысловасці і комплекснай лагістыкі, ствараць свае дызайнерскія калекцыі. Цяпер вельмі шмат прыгожага прэт-а-партэ (мадэляў адзення для масавай вытворчасці. — **Аўт.**), у Беларусі дастаткова таленавітых дызайнераў. Каб цябе заўважылі, трэба быць яркай індывідуальнасцю, трэба проста прыдумаць... Хоць гэта не проста «прыдумкі», гэта, напэўна, прыходзіць звыш...

Менавіта так «пачалася» «Абрадvея» — з рантоўнага імпульсу, азарэння, кажа суразмоўніца:

— Я выстаўляла ў Палацы Рэспублікі сваю калекцыю, і там жа экспанаваўся адноўлены Крыж Ефрасінні Полацкай. Зразумела, гэта святыня, але мяне ўразіла, наколькі ён прыгожы нават чыста знешне. І я тут жа «ўбачыла» колеравую гаму і акцэнты дызайну маёй новай калекцыі: золата, жэмчуг, вышыўка ніткамі ў тонах каштоўных камянёў, якія ўпрыгожваюць Крыж. Я падумала: гэтая святыня — з глыбокім сэнсам. А які сэнс надам сваёй калекцыі я? Пра што раскажу гісторыю? І зразумела: аб сваёй краіне, яе душы, яе абрадах. Бо невыпадкова Бог адправіў мяне вывучаць усё гэта... І, як кажуць, пазл сышоўся.

***— Дарэчы, вышыўка на ўсіх гэтых касцюмах ручная?***

— Зразумела. Я натхнялася нашымі бабулямі і прабабулямі. У іх жа нічога не было, нават электрычнага святла! І з нічога яны стваралі шэдэўры. Я падумала: а мне слабо? Вышывала начамі. Распавяла гісторыю. Цяпер гэтая гісторыя пачала жыць уласным жыццём. Дарэчы, мая мінулая калекцыя таксама натхнёная талентам беларускіх майстрых: у яе аснове — старажытная дывановая тэхніка ручнога ткацтва. Там зусім іншы пасыл. Мне хацелася расказаць пра свой погляд на лёс. Асноўны дэкор калекцыі — канцэнтрычныя паўакружнасці. Мы самі гаспадары свайго жыцця: захочам — зробім яго яркім, захочам — цьмяным. Кожны можа выткаць жыццё тымі колерамі, якімі пажадае. Але ёсць і чорныя плямы — бачыце? Гэта не смутак, не нагода для адчаю. Проста адсутнасць колеру: месца для лёсу. Ён заўсёды ўносіць свае карэктывы...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва Святланы ІВАШЫНАЙ.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного торгового унитарного предприятия «ЗападХимТорг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | TM. 25 Сейф | 153,60 | 15,36 | 7,68 |
| 2 | Сейф ASM.63T | 412,80 | 41,28 | 20,64 |
| 3 | LE-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 4 | LE-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 5 | LE-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 6 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 7 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 8 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 9 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 10 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 11 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 12 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 13 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 14 | TM.63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 15 | TM.63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 16 | TM.63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 17 | TM.63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 18 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 19 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 20 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 21 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 22 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 23 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 24 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 25 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 26 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 27 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 28 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 29 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 30 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 33,60 | 3,36 | 1,68 |
| 31 | ASM 63T Сейф | 412,80 | 41,28 | 20,64 |
| 32 | ASM 63T Сейф | 412,80 | 41,28 | 20,64 |
| 33 | ASM 63T Сейф | 412,80 | 41,28 | 20,64 |
| 34 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 35 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 36 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 37 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 38 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 39 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 40 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 41 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 42 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 43 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 44 | Тележка ТГ-150м | 307,20 | 30,72 | 15,36 |
| 45 | TM. 63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 46 | TM. 63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 47 | TM. 63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 48 | TM. 63T Сейф | 220,80 | 22,08 | 11,04 |
| 49 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 50 | LS-24 Шкаф | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 51 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 52 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 53 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 54 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 55 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 56 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 57 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 58 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 59 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 60 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 61 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 62 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 63 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 64 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 65 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 66 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 67 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 68 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 69 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 70 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 59,52 | 5,95 | 2,98 |
| 71 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72835 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 72 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72836 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 73 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72839 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 74 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72840 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 75 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72847 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 76 | Морозильный ларь МЛГ-350 красный, инв. № 72851 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 77 | Морозильный ларь МЛГ-350, инв. № 73063 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 78 | Морозильный ларь МЛГ-350, инв. № 73065 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |
| 79 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 73521 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 80 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 73528 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 81 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75132 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 82 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75133 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 83 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75134 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 84 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75135 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 85 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75136 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 86 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75137 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 87 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75138 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 88 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75139 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 89 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75146 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 90 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74284 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 91 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74300 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 92 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74301 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 93 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74302 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 94 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74303 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 95 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74315 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 96 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74318 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 97 | Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. RAL 8025, инв. № 74319 | 1 056,00 | 105,60 | 52,80 |
| 98 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74566 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 99 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74577 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 100 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74578 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 101 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74588 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 102 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74592 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 103 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74598 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 104 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74603 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 105 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74609 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 106 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74610 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 107 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74641 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 108 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 74642 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 109 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 32221 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 110 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 77081 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 111 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 77083 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 112 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 77085 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 113 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 77086 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 114 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 77099 | 1 440,00 | 144,00 | 72,00 |

В отношении лотов проводятся вторые повторные торги.
**Стоимость снижена на 20 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 183 (30317) от 19.09.2024, стр. 10

**Местонахождение лотов:**
Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **22 октября 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 9 октября 2024 года до 16.00 18 октября 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», частное предприятие «ЗападХимТорг», проводимых 22.10.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста по лотам № № 1–89 – 10 %, по лотам № № 90–114 – 9 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра звонить по тел. +375293042560, Андрей.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 365 06 97 (Екатерина) (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корпус 1, комн. 6, УНП 590828925)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **2024.Ч.002.00114** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. С. Панковой, 1, тел.: +375 (212) 22-80-44, +375 (2132) 6-19-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:**
коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 31.10.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 230/С-11645 общей площадью 713,8 кв. м, наименование – здание котельной, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Витебская, на земельном участке с кадастровым № 222750100001001557 площадью 0,6655 га по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Витебская (право постоянного пользования, доля 1/1).

Целевое назначение зем. участка – зем. участок для использования под котельную.

**Нач. цена:** 22 000,00 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток:** 2200,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 30.10.2024.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (Претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 11 рабочих дней с даты утверждения протокола эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, определенные условиями договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 712-12-71.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1: погрузчик-экскаватор цепной ДЗ-133 ЭЦ, год выпуска 2002 г., регистрационный знак АК-1 8514, заводской номер 0811** | 15 960,00 | 798,00 |

**Местонахождение:** г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К. **Организатор торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by. **Продавец:** ОАО «Стройгаз, г. Брест», 224032, г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К, тел./факс 80162 34 04 76. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 календарных дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в течение 5 календарных дней со дня заключения договора. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг торгов:** 5 %

**Электронные торги состоятся 24 октября 2024 г. в 11.00**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG». Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 22.10.2024 до 16.00**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# ЖЫЦЦЁ З РЫЗЫКАЙ

## Шкодныя звычкі, якія нішчаць сэрца

**Як вядома, сярод прычын заўчаснай смерці сардэчна-сасудзістыя захворванні ўпэўнена займаюць першае месца. Але ці ўсё мы робім для таго, каб дапамагчы галоўнаму органу нашага арганізма працаваць у роўным і спакойным рытме і пазбегнуць сур'ёзных праблем, якія прыводзяць да самых дрэнных наступстваў? Разам з урачом агульнай практыкі (загадчыкам) аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Святланай ЯНУШКА разбіраемся, што найбольш шкодзіць нашаму сэрцу.**



***— Святлана Аляксандраўна, якія з нашых звычак найбольш небяспечныя для сэрца?***

— Курэнне. Вядома, што верагоднасць узнікнення інфаркту, інсульту і іншых сур'ёзных захворванняў у курцоў удвая вышэйшая, чым у людзей, якія не кураць, таму гэту звычку трэба кідаць. Але ўсе курцы ведаюць, як цяжка гэта зрабіць. Аднаго жадання і сілы волі для пазбаўлення ад нікацінавай залежнасці можа быць недастаткова, таму сёння існуе цэлы шэраг фармакалагічных прэпаратаў, якія дапамагаюць яе перамагчы.

Падабраць неабходны сродак вам дапаможа ўрач, але, каб канчаткова кінуць курыць, трэба змяніць свае паводзіны ў тых сітуацыях, у якіх вы прывыклі закурваць. Замест таго, каб узяць цыгарэту, выпіце вады, пажуйце жуйку, з'ешце яблык ці моркву. Будзе карысна заняць нечым рукі: напрыклад, у ЗША і Канадзе тым, хто хоча кінуць курыць, урачы рэкамендуюць выкарыстоўваць так званыя «пацеркі для нервовых» — кароткую нітку караляў, якія перабіраюць пальцамі для зняцця напружання. Гэта дапаможа крыху расслабіцца і адцягнуцца ад думак аб цыгарэце.

***— Шкодзіць сардэчна-сасудзістай сістэме і нездаровая ежа...***

— Сапраўды, харчаванне — адзін з найважнейшых фактараў, якія ўплываюць на стан сардэчна-сасудзістай сістэмы. Вельмі важна выключыць спажыванне «шкодных» (гідрагенізаваных) тлушчаў, якія змяшчаюцца ў маргарыне, смажаных стравах. Гэтыя тлушчы дрэнна засвойваюцца, павялічваюць узровень халестэрыну, спрыяюць з'яўленню лішняй вагі і сур'ёзна абцяжарваюць работу сэрца. Трэба абмежаваць ці зусім выключыць спажыванне цукру-рафінаду, у тым ліку ў кандытарскіх вырабах.

А вось аліўкавы алей першага халоднага адціску і часнок, наадварот, спрыяюць паніжэнню ўзроўню халестэрыну ў крыві. Абавязкова ў рацыёне павінны быць прадукты, якія ўтрымліваюць поліненасычаныя тлустыя кіслоты. Іх асноўнай крыніцай з'яўляецца рыбін тлушч, якога асабліва шмат у марской рыбе — сёмзе, фарэлі, скумбрыі, сардзінах.

Акрамя таго, як мага менш рэкамендуецца ўжываць вугляводаў — макаронных вырабаў, бульбы, хлеба, хоць і адмовіцца ад іх наогул наўрад ці атрымаецца. Лепш аддаваць перавагу хлебу і макаронным вырабам з цэлага зерня, а таксама ўвесці ў паўсядзённы рацыён вотруб'е.

Выключна важныя для нармальнай работы сэрца гародніна і садавіна. Найбольш карысныя — вішні, чарэшні, журавіны, чарніцы, сушаныя абрыкосы (курага) і яблыкі, таму іх рэкамендуецца ўжываць як мага часцей. З гародніны варта звярнуць увагу на шпінат — у ім, акрамя клятчаткі, утрымліваюцца вітаміны групы B, калій і лютэін — рэчывы, неабходныя для нармальнай работы сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Як вядома, лішак солі ў ежы прыводзіць да павышэння артэрыяльнага ціску і тым самым павялічвае рызыку развіцця ішэмічнай хваробы сэрца. Таму варта абмежаваць яе спажыванне. Даросламу чалавеку дастаткова ўсяго адной чайнай лыжкі ў суткі, а хворым на цукровы дыябет і людзям, старэйшым за 50 гадоў, гэтую норму варта паменшыць удвая.

***— Якія вітаміны і мікраэлементы дапамагаюць нашаму галоўнаму органу?***

— Для паўнавартаснага здароўя сэрцу патрэбны вітаміны групы B, антыаксіданты — вітаміны C і E, мікраэлементы кальцый, калій, магній, селен, а таксама каэнзім Q10. Таму ўжывайце ежу, багатую гэтымі рэчывамі, а пры неабходнасці прымайце дадаткова вітамінна-мінеральныя комплексы.

***— Як алкаголь уплывае на работу сэрца?***

— Ён аказвае разбуральнае дзеянне на сардэчную мышцу, садзейнічае павышэнню артэрыяльнага ціску і з'яўленню лішняй вагі, таму для захавання здароўя сэрца ўжыванне алкаголю павінна быць зведзена да мінімуму.

***— Як вядома, сэрца — гэта мышачны орган. Колькі фізічнай нагрузкі яму патрабуецца?***

— Так, сардэчнай мышцы, як, зрэшты, і іншым органам, патрабуюцца рэгулярныя трэніроўкі. Тым, хто хоча захаваць сэрца здаровым, трэба памятаць, што для нармальнай яго работы неабходна выконваць фізічныя практыкаванні мінімум 3-4 разы на тыдзень па 30 хвілін.

***— Што яшчэ негатыўна ўплывае на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы?***

— Стрэс і нервовае перанапружанне — лютыя ворагі нашага сэрца. Адзін з самых простых і даступных, прыемных і эфектыўных спосабаў зняцця стрэсу — пешыя прагулкі па лесе або парку, араматэрапія. Вячэрняя ванна з эфірнымі алеямі — выдатны сродак для расслаблення і зняцця напружання.

Лад жыцця

# Упадак сіл

## Як змагацца з выгараннем?

**Адсутнасць сіл і энергіі, якія нярэдка абвастраюцца восенню, вядомы як эмацыянальнае выгаранне. Пра яго сімптомы, прычыны і простыя рашэнні, якія дапамогуць круглы год адчуваць сябе на ўздыме, размаўляем з урачом-гігіеністам аддзялення інфармацыянальна-метадычнай работы Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алінай МЯДЗВЕДЗЬ.**

***— Аліна Ігараўна, давайце спачатку вызначым, што такое эмацыянальнае выгаранне?***

— Гэта стан фізічнага і эмацыянальнага знясілення, якое ўзнікае ў выніку хранічнага стрэсу і празмернай нагрузкі. Гэта не проста стомленасць, якая праходзіць пасля добрага адпачынку. Эмацыянальнае выгаранне закранае ўсе аспекты жыцця чалавека: работу, асабістыя адносіны, здароўе. Важна разумець, што выгаранне развіваецца паступова і можа мець сур'ёзныя наступствы, калі яго ігнараваць.

***— Якія прыкметы эмацыянальнага выгарання?***

— Сімптомы часта развіваюцца паступова, на ранніх стадыях многія людзі не ўсведамляюць, што знаходзяцца ў гэтым стане, пакуль пэўныя прыкметы не стануць невыноснымі. Найперш гэта хранічная стомленасць: пачуццё знясілення не толькі фізічнага, але і эмацыянальнага. Нават пасля адпачынку чалавек не адчувае сябе свежым і поўным сіл, няма папаўнення рэсурсу для далейшай дзейнасці. З'яўляецца агульная негатыўная ўстаноўка на жыццёвыя і прафесійныя перспектывы — па тыпе «як ні старайся, усё роўна нічога не атрымаецца».

Таксама характэрная раздражняльнасць, у тым ліку на малаважныя, дробныя падзеі. Нярэдка далучаюцца праблемы са сном: цяжкасці з засынаннем, частыя абуджэнні ўначы ці, наадварот, празмерная санлівасць.

Дадаюцца і фізічныя сімптомы: галаўныя болі, расстройствы страўнікава-кішачнага тракта, мышачнае напружанне таксама могуць быць прыкметамі эмацыянальнага выгарання.

***— Як пазбегнуць эмацыянальнага выгарання?***

— Вельмі важна стварыць камфортную працоўную абстаноўку — планаваць справы па тэрміновасці і важнасці, рабіць кароткія перапынкі на адпачынак ці змену дзейнасці. Тут неабходна дакладна прытрымлівацца балансу «праца — вольны час». Гэта значыць, пакідаць работу на рабоце і старацца не вырашаць рабочыя пытанні па-за офісам. «Выгаранне» ўзмацняецца кожны раз, калі межы паміж работай і домам пачынаюць сцірацца і работа займае большую частку жыцця. Неабходна мець вольныя вечары і выхадныя.

Дапаможа і здаровы лад жыцця, у прыватнасці рэгулярныя фізічныя практыкаванні. Пачніце, напрыклад, з 15-хвіліннай прагулкі кожны дзень. Важнае і збалансаванае харчаванне: уключыце ў рацыён больш агародніны і садавіны, абмяжуйце спажыванне кафеіну і цукру. Ні ў якім разе нельга ігнараваць здаровы сон: наладзьце яго рэгулярны рэжым, мінімум 7-8 гадзін у суткі, пазбягайце гаджэтаў за дзве гадзіны да сну.

Часта выратоўвае наяўнасць хобі — займальнае і радаснае правядзенне часу таксама з'яўляецца адпачынкам ад рабочых задач і руціны.

Абавязкова трэба адзначыць, што эмацыянальнае выгаранне можна прадухіліць і пераадолець, калі ставіцца свядома і з клопатам да самога сябе і ўласнага здароўя.

Бацькам на заметку

# ІНВЕСТЫЦЫІ ВА ЎСМЕШКУ

## Як выбраць сродкі для поласці рота

**Сродкі гігіены поласці рота цяпер прадстаўлены даволі шырока: зубныя шчоткі, пасты, эліксіры, зубныя ніці, зубачысткі, гелі, пасцілкі, жавальныя гумкі, дражэ, гігіенічныя таблеткі. Як іх правільна падабраць для дзіцяці, расказала дзіцячы ўрач-стаматолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Ала ГРЭБНЕВА.**



### ЗУБНЫЯ ШЧОТКІ

У цяперашні час аддаецца перавага зубным шчоткам са штучным шчаціннем. Гэта тлумачыцца тым, што сінтэтычнае валакно, якое выкарыстоўваецца для рабочай часткі шчоткі, можа быць зададзенай цвёрдасці, пругкасці, канцы яго закругленыя і не траўміруюць слізістую абалонку дзясны. Яны ў меншай меры, чым шчоткі з натуральным шчаціннем, падвяргаюцца мікробнаму забруджванню.

Памер зубной шчоткі неабходна падбіраць для кожнага дзіцяці індывідуальна: рабочая частка не павінна перавышаць памеру 2-3 дыяметраў каронак зубоў. Пучкі шчаціння павінны размяшчацца досыць рэдка, форма рабочай часткі — ладдзепадобная. Мяняць зубную шчотку мэтазгодна кожныя 2-2,5 месяца, захоўваць яе варта ў вымытым выглядзе рабочай часткай уверх у шклянцы.

### ЗУБНЫЯ ПАСТЫ

Зубныя пасты з'яўляюцца асноўным сродкам догляду поласці рота. Вылучаюць дзве групы паст: лячэбна-прафілактычныя і гігіенічныя. Першыя ў залежнасці ад уведзеных у іх склад біялагічна актыўных рэчываў могуць валодаць супрацьзапаленчым або супрацькарыёзным дзеяннем. У групу карыесапрафілактычных зубных паст уваходзяць «Колгейт», «Бленд-а-мед», «Сілка», «Аква фрэш» і іншыя.

Выбар зубной пасты для дзіцяці павінен зрабіць урач-стаматолаг з улікам узросту і стану цвёрдых тканак зубоў. Дзецям дашкольнага ўзросту мэтазгодна карыстацца слабапеністымі зубнымі пастамі, а дзецям школьнага ўзросту — пеністымі. Фторзмяшчальныя зубныя пасты мэтазгодна ўжываць у перыяд другаснай мінералізацыі.

### ЗУБНЫЯ НІЦІ

Усё больш шырокае прымяненне для зняцця зубнога налёту на пэўных паверхнях зубоў знаходзяць зубныя ніці. Аднак дзецям іх мэтазгодна выкарыстоўваць або пры правядзенні прафесійнай гігіены поласці рота, або ў старшым школьным узросце. Для гэтых жа мэт ужываюцца і зубачысткі.

### ЖАВАЛЬНЫЯ ГУМКІ

У апошнія гады праведзена даволі шмат даследаванняў па вывучэнні ўплыву жавальнай гумкі на захворванні тканак і органаў поласці рота. Адзначана, што гумка змяншае колькасць адкладаў на зубах, і, калі ўвесці ў яе склад лячэбна-прафілактычныя дабаўкі, яна будзе аказваць і прафілактычнае дзеянне.

### ЗУБНЫЯ ЭЛІКСІРЫ

Асноўнае прызначэнне зубных эліксіраў — дэзадарацыя поласці рота. Яны ўжываюцца для паласкання пасля чысткі зубоў ці пасля прыёму ежы. Увядзенне ў склад эліксіраў лячэбна-прафілактычных дабавак дазваляе выкарыстоўваць іх у якасці дадатковага прафілактычнага сродку. Так, зубны эліксір «Спецыяльны» змяшчае фтарыд натрыю і вітамін B.

## ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 15/24 ПО ПРОДАЖЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ в г. Минске

Предмет аукциона:

**Лот № 1 – Капитальное строение с инвентарным номером № 500/С-33527, расположенное на земельном участке площадью 0,0532 га с кадастровым номером 500000000002000460, находящееся по адресу: г. Минск, ул. Встречная, д. 37, площадь – 630,4 кв. м, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда. Начальная цена лота – 235 000 долларов США с учетом НДС 20 %, шаг аукциона – 5 % от начальной цены**

Аукцион проводится **20.11.2024 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 18.11.2024 включительно до 17.00**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. внести задаток в размере 15 000 рублей на расчетный счет продавца BY86BLNB30120000009194000933 в ОАО «БНБ-Банк», БИК BLNBBY2X, получатель платежа – ООО «ГЭС», УНП 101564434, назначение платежа – «Задаток для участия в аукционе № 15/24»;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице Лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона, устанавливающего права, обязанности и ответственность участника аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) возмещает организатору аукциона затраты на его организацию и проведение в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке. Оплата предмета аукциона производится в белорусских рублях по курсу доллара США к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

**Организатор аукциона и оператор ЭТП: ООО «Реалконсалтинг», г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22 • auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by/, https://realtorgi.by/**
**Продавец – ООО «ГЭС», г. Минск, ул. П. Бровки, 15, к. 421**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by** |
